

ЧАМУ ПАЗАЙЗДРОСЦІЎ БЫ АРХІМЕД?

ЧЫРВОНКА

НЕ САМАЯ ГОРШАЯ ЗВЫЧКА – ЧЫТАЦЬ

ЧЫРВОНКА



Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

11 КРАСАВІКА 2019 г. ЧАЦВЕР № 68 (28935)

## ЦЫТАТА ДНЯ



**Канстанцін ШУЛЬГАН, міністр сувязі і інфарматызацыі:**

*«Калі гаварыць пра планы па развіцці 5G у Беларусі, то тут павінен быць разумны баланс паміж выдаткамі і эфектам. Доследныя зоны ўжо створаны, прапрацоўваюцца ўсе нюансы, усе аспекты тэхналогіі 5G. Вывучаем, якое прымяненне тэхналагічныя навінкі знойдуць у любой з галін, наколькі гэта будзе эфектыўна. Калі раней мы ўкаранялі тэхналогіі сотавай сувязі з адставаннем ад сусветных лідараў і тады было ў каго пераняць вопыт, то цяпер ідзём у нагу з часам. А гэта накладвае свой адбітак».*

# Мадэлі, на подыум!



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

Адзіны ў Круглянскім раёне народны майстар Беларусі па ткацтве паясоў, бісерапляценні і вышыўцы Ларыса ЛЯМЦАВА *(на фота злева)* падрыхтавала сапраўдную калекцыю тэкстыльных лялек, адзетых у беларускія строі, іх майстрыха паказвае на розных святах і фестывалях. А яшчэ выстаўляе на ўсеагульны агляд у фае мясцовага Дома культуры. Часта зладзіць адмысловую экспазіцыю круглянскай «куцюр'е» дапамагае яе сяброўка, калега-майстрыха і дырэктар Дома раместваў Наталля АНІКОВІЧ.

## КОРАТКА

• **Упершыню ў гісторыі навукоўцы апублікавалі выяву чорнай дзіры, якая была зроблена сеткай радыётэлескопаў Event Horizon Telescope.**



• Інфляцыя ў Беларусі ў сакавіку склала 0,4 %.

• **Два робатызаваныя самазвалы БелАЗ праходзяць выпрабаванні ў Хакасіі.**

• З новага навучальнага года ў Беларусі плануецца пачаць падрыхтоўку крызісных псіхолагаў для ўстаноў адукацыі.

• **У Брэсце 13 красавіка пройдзе агульнагарадская экалагічная акцыя.**

ISSN 1990 - 763X

Вандроўка патрыётаў

# ПЕХАМ ПА ЎРАЖАННІ

## Якія таямніцы хаваюць беларускія экасцежкі?

**За мяжой народ без ваганняў адмаўляецца ад водпуску all inclusive (*англ.* «усё ўключана») дзеля яднання з некранутай прыродай. Стомленыя ад гарадскога камфорту людзі едуць туды, дзе можна паназіраць за рэдкімі відамі птушак і жывёл, удыхнуць водар лясных першацветаў, прайсціся па мяккім моху і глытнуць крынічнай вады. Беларусам у гэтым плане пашанцавала: у які раён ні паедзь — знойдзеш як мінімум ландшафтны заказнік, а ў лепшым выпадку і цэлы нацыянальны парк. Чаму прагулкі па экасцежках — той самы від турызму, які падыдзе ўсім, разбіралася карэспандэнт «Звязды».**

Спытай любога беларуса, чым славіцца наша краіна, дык ён абавязкова адкажа: «Лясамі ды балотамі». Магчыма, прыгадае Белавежскую і Налібоцкую пушчы, нават калі сам там ніколі не быў (а такіх, на жаль, хапае). Затое гаворку пра марскія берагі Турцыі ці Егіпта ў нас кожны другі падтрымае. Сумна. У такія моманты прыгадваюцца радкі Паэта пра родную краіну:

*Я скалясіў і змераў пешкі*
*Твае прасторы ўдоўж і ўшыр —*
*І ўсе шляхі, дарогі, сцежкі*
*Пакрыжаваліся ў душы.*

Хочацца зачытаць гэты верш уголас і паклікаць беларусаў шукаць тыя самыя шляхі-дарогі, каб яны і ў нашых душах пакрыжаваліся. Тым больш што экасцежак у нас цяпер на любы густ — трэба толькі абраць найбольш прыдатную.

СТАР. 4

А вы ведалі?

# Амартызацыйнае крэсла, спецыфічная ежа і адчуванне палёту

## У Тамашоўцы Брэсцкага раёна працуе адзіны ў краіне музей касманаўтыкі



Фота Валерыя КАРАЛЯ.

СТАР. 13

Наталля ГАДУН у зале музея.

# Пашана за працу

## Больш за 190 беларусаў атрымалі дзяржаўныя ўзнагароды

**Прэм'ер-міністр Беларусі Сяргей РУМАС па даручэнні Прэзідэнта ўручыў дзяржузнагароды найлепшым прадстаўнікам розных сфер. Урачыстая цырымонія адбылася ў Палацы Рэспублікі.**



Фота БелТА.

**У ліку ўзнагароджаных медалём Францыска Скарыны — ігуменля гродзенскага Раство-Багародзічнага стаўрапігіяльнага жаночага манастыра Гаўрыіла.**

Сярод узнагароджаных за шматгадовую плённую працу, высокі прафесіяналізм і ўзорнае выкананне службовых абавязкаў — аграрыі, медыкі, навукоўцы, будаўнікі, прадстаўнікі творчай інтэлігенцыі, прамысловасці, энергетыкі. «Кожны з вас зрабіў свой уклад у развіццё незалежнай і квітнеючай Беларусі», — адзначыў Сяргей Румас.

Кіраўнік урада звярнуў увагу, што сельская гаспадарка штогод фарміруе больш за сем працэнтаў ВУП і 15 % у агульным аб'ёме экспарту тавараў. Адзначаны заслугі будаўнікоў, якія ўзводзілі клінічны медыцынскі цэнтр у Ждановічах і займаліся рэканструкцыяй аўтамабільнага моста цераз Прыпяць у Жыткавіцкім раёне.

Сяргей Румас падкрэсліў, што за апошнія гады значных поспехаў дасягнула і авіякампанія «Белавія»; адзначыў ролю грамадскіх дзеячаў у развіцці ветэранскага руху, а таксама журналістаў — у фарміраванні ўспрымання свету грамадзянамі. «Дзяржава і надалей будзе падтрымліваць таленавітых і адораных творчых людзей, асабліва тых, хто праслаўляе нашу краіну і натхняе мільёны», — рэзюмаваў кіраўнік урада.

# Сучасныя тэхналогіі да паслуг выбаршчыкаў

## «Пазнаёміцца» з кандыдатам можна будзе ў мабільнай праграме

**У Беларусі перадавыя тэхналогіі будуць выкарыстаны пры выбарчым працэсе. Цэнтральная камісія па выбарах і правядзенні рэспубліканскіх рэферэндумаў нашай краіны — сябра Сусветнай асацыяцыі выбарчых органаў са штаб-кватэрай у Паўднёвай Карэі. Што да валодання інфармацыйнымі тэхналогіямі, супрацоўнікі ЦВК напоўніцу адпавядаюць патрабаванням сучаснасці, падкрэсліла старшыня камісіі Лідзія ЯРМОШЫНА ў размове з журналістамі.**

Ужо няма неабходнасці прыцягваць супрацоўнікаў ЦВК для кантролю выбарчага працэсу — гэтую функцыю ўзялі на сябе сайты, у выніку невялікі калектыў у сталіцы сочыць за ўсёй тэрыторыяй краіны і пры неабходнасці адразу ўмешваецца. Як паведаміла Лідзія Ярмошына, у наступных выбарчых кампаніях удасканаліцца працэс інфармавання выбаршчыкаў. Беларускі рэспубліканскі саюз моладзі і Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт інфарматыкі і радыёэлектронікі за ўласны кошт распрацоўваюць мабільную праграму, указаўшы ў якой свой адрас, грамадзянін змажа вызначыць не толькі нумар выбарчага ўчастка і месца яго знаходжання, але і спіс кандыдатаў.

На сайце Цэнтрвыбаркама плануецца размяшчэнне дакладных электронных картаў выбарчых акруг, што дазволіць пазбегнуць памылак пры зборы подпісаў.

Размова журналістаў са старшынёй ЦВК адбылася ў Палацы прадстаўнікоў пасля пасяджэння круглага стала «Роля кіраўніка ў сістэме дзяржаўнага кіравання. Гісторыя. Практыка» да 105-годдзя з дня нараджэння Кірылы Мазурава. Удзельнікі гутаркі згадзіліся, што поспех любой дзяржавы залежыць ад кадравай палітыкі. А дзейнасць першага сакратара ЦК КПБ Кірылы Мазурава і сёння можа заставацца ўзорам для маладых пакаленняў кіраўнікоў. Пытанне толькі, як іх выхаваць.

«У краіне вызначыліся тэндэнцыі прыцягнення моладзі да рашэння пытанняў палітычнага жыцця — напрыклад, з дапамогай маладзёжных парламентаў. Гэтыя ўтварэнні, а можа, нават і нефармалізаваныя групы могуць удзельнічаць у вырашэнні самых важных дзяржаўных пытанняў — па меншай меры, пытанняў адукацыі, навучання, фарміравання асобы кіраўніка», — падкрэсліла Лідзія Ярмошына.

Яна прапанавала Пастаяннай камісіі па адукацыі, культуры і навуцы прадумаць сістэму круглых сталоў рознай тэматыкі, каб менавіта моладзь магла сказаць, чаго не хапае ў адукацыі: «Парламент, як орган, які прадстаўляе ўсё насельніцтва, павінен узяць на сябе ролю арганізатара грамадскіх дыскусій».

**Варвара МАРОЗАВА.**

Пасля «Вялікай размовы»

# Аб'ект найважнейшага прызначэння

## Будаўніцтва анкалагічнага цэнтра ў Гродне распачнецца ўжо сёлета

**Пытанне, якое датычыцца анкалагічнага цэнтра, паступіла ад гродзенца Юрыя Куляшова падчас акцыі, прымеркаванай да «Вялікай размовы з Прэзідэнтам». Жыхар абласнога цэнтра нагадаў аб тым, што гродзенскі рэгіён — адзіны ў краіне, дзе няма свайго анкадыспансера. І пацікавіўся: калі пачнецца яго будаўніцтва?**

Патрэба ў такой установе сапраўды даўно наспела, адзначылі ў абласным упраўленні аховы здароўя. У Гродзенскай вобласці на ўліку стаіць каля 30 тысяч анкахворых, якія вымушаны ездзіць у Брэст альбо ў Мінск.

Захады па стварэнні такога цэнтра ў Гродне рабіліся неаднаразова. На жаль, не спраўдзіліся спадзяванні па рэалізацыі дзяржаўна-прыватнага партнёрства. Праблема будзе вырашацца паступова.

Падрыхтавана праектная дакументацыя, вызначаны крыніцы фінансавання. На гэтыя мэты будуць накіраваны і сродкі дзяржаўнай інвестпраграмы. Стаіць задача ўвесці аб'ект у эксплуатацыю ў максімальна кароткі тэрмін. Па словах **намесніка начальніка аховы здароўя Гродзенскага аблвыканкама Наталлі АНТАНОВІЧ**, неабходная база створана, ёсць вопытныя спецыялісты, якія змогуць выкарыстоўваць найноўшую методыку лячэння на самым сучасным абсталяванні. Новыя тэхналогіі дазволяць удасканаліць работу па ранняй выяўленні анказахворванняў і своечасова аказваць патрэбную дапамогу. Плануецца, што тут будзе працаваць каля тысячы работнікаў.

Сёлета, згодна з інвестыцыйнай праграмай, будзе выдзелена 10 мільёнаў рублёў на пачатак работ. Паралельна плануецца адкрыццё крэдытнай лініі з арабскімі інвестарамі. Мяркуецца, што на ўвесь аб'ект, які размесціцца на базе клінічнай бальніцы № 3, спатрэбіцца каля 100 мільёнаў долараў, палова з якіх — гэта кошт абсталявання. Работы будуць весціся ў некалькі этапаў і разлічаны да 2020 года.

Адразу плануецца пачаць будаўніцтва радыелагічнага корпуса. Другая чарга — гэта аперацыйны блок і сямipавярховы лячэбны корпус. Затым пачнецца рэканструкцыя будынкаў існуючай бальніцы пад палатныя аддзяленні. У адным з такіх карпусоў размесціцца паліклініка на 300 наведванняў у змену. Побач з ёй будзе пабудаваны пансіянат і блок клінічных кафедраў з вучэбнымі памяшканнямі і залай на 150 месцаў. Агульная плошча аб'екта будзе дасягаць 9 гектараў.

**Маргарыта УШКЕВІЧ.**

# ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

### У Францыі прыдумалі новы спосаб барацьбы з беднасцю



З сярэдзіны красавіка школьнікі Манпелье, Тулузы і Ам'ена змогуць бясплатна снедаць у сталовых, а ўжо з верасня праграма будзе дзейнічаць на тэрыторыі ўсёй Францыі, перадае Euronews. Паводле статыстыкі, адно дзіця з дзесяці прыходзіць у школу галодным, а значыць, у яго менш шанцаў дамагчыся поспехаў у вучобе, чым у яго аднакласнікаў, кажа дзяржсакратар пры міністру аховы здароўя Крыстэль Дзюбо. У асноўным гэта праблема датычыцца самых бедных слаёў насельніцтва. Па словах Дзюбо, увядзенне бясплатных сняданкаў дапаможа ў барацьбе з першапрычынай сацыяльнай няроўнасці. Абед за адзін еўра — яшчэ адна праграма, прапанаваная французскімі ўладамі. Запушчана яна таксама будзе ў гэтым месяцы. Скарыстацца льготай змогуць школьнікі з 10 тысяч камун. Гэтыя дзве праграмы сталі часткай нацыянальнай стратэгіі па барацьбе з беднасцю, якую ў мінулым верасні прадставіў прэзідэнт Эмануэль Макрон. На рэалізацыю праекта было выдзелена 8,5 мільярда еўра.

### Брытанцам пачалі выдаваць пашпарты без пазнакі «Еўрапейскі саюз»





Жыхарам Вялікабрытаніі пачалі выдаваць пашпарты без ранейшага надпісу «Еўрапейскі саюз» на вокладцы, нягледзячы на адтэрміноўку брэксіту. «Нееўрапейскія» дакументы ўведзены ў абарачэнне з 30 сакавіка, гэта значыць на наступны дзень пасля таго, як Брытанія павінна была выйсці з ЕС, паведамляе Independent. У міністэрстве ўнутраных спраў растлумачылі, што пашпарты з надпісам «Еўрапейскі саюз» будуць выдавацца, пакуль не скончацца. Брытанцы не змогуць самі выбіраць паміж узорамі пашпартоў. У МУС падкрэслілі, што іншых адрозненняў паміж «еўрапейскімі» і «нееўрапейскімі» пашпартамі няма, абодва яны могуць выкарыстоўвацца для падарожжаў за мяжу. З канца 2019 года брытанскія пашпарты пачнуць выпускаць з вокладкай традыцыйнага сіняга колеру замест цяперашняга бардовага, прынятага ў краінах Еўрасаюза. Яны будуць уводзіцца паступова. Адзначаецца, што грамадзяне, якія будуць мяняць дакументы ў перыяд з канца 2019-га да пачатку 2020 года, атрымаюць сінія або бардовыя пашпарты. З пачатку 2020-га будуць выдавацца пашпарты толькі сіняга колеру.

### Мадонна выступіць на «Еўрабачанні». За мільён долараў



Буйны ганарар атрымае Мадонна за тое, што выканае ў фінале «Еўрабачання» дзве песні, адна з якіх, як паведамляюць СМІ, утрымлівае палітычны падтэкст. На міжнародным песенным конкурсе 60-гадовая поп-зорка выступіць у якасці госці. У Ізраіль разам са спявачкай прыедзе каманда са 160 чалавек. Пры гэтым, як паведамляецца, ганарар Мадонне выплацяць не арганізатары конкурсу, а ізраільска-канадскі бізнесмен Сільван Адамс. «Еўрабачанне» ў Тэль-Авіў прывезла спявачка Нета Барзілай. Летась яна перамагла ў Лісабоне з песняй Тоу, амаль на 100 ачкоў абагнаўшы прадстаўніцу Кіпра. Першапачаткова прэм'ер-міністр Біньямін Нетаньяху абяцаў, што ў 2019 конкурс пройдзе ў Ерусаліме, але ў выніку было вырашана правесці «Еўрабачанне» ў Тэль-Авіве. У канцы сакавіка з'явілася інфармацыя аб тым, што конкурс можа быць адменены або перанесены ў іншае месца з-за эскалацыі палесціна-ізраільскага канфлікту, але ніякіх далейшых заяў з гэтай нагоды Еўрапейскі вяшчальны саюз не рабіў.


### ЗАО «Белреализация» объявляет аукцион

Организатор торгов: **ЗАО «Белреализация»** (УНП 191113330), 220089, г. Минск, ул. Уманская, 54, 4-й этаж паркинга, каб. 27, тел.: (8017) 298-53-53; (8029) 690 54 09, **WWW.BELTORGI.BY**.

Продавец: Производственное унитарное предприятие «Монтажлегмаш» (УНП 490086155) в лице антикризисного управляющего частного предприятия «Эффективное Управление», тел. +375 (29) 645-45-14.

Повторные публичные торги в электронной форме будут проведены: **23 апреля 2019 г**. с 09.00 до 17.00 на электронной торговой площадке WWW.BELTORGI.BY. Извещение о ранее проведенных торгах опубликовано на сайте bankrot.gov.by.

| № п/п | Предмет торгов | Начальная цена, бел. руб. без НДС |
|---|---|---|
| 1 | Грузовой специальный автокран КС 3577 на шасси МАЗ 5334, 1990 г. в., рег. № АВ 0135-3 | 3 750,00 |
| 2 | Металлическая платформа (размер 6000x6000x100) из рифленых металлических листов | 1 500,00 |
| 3 | Магнитная система Tecnomagnete Bat Grip 300 | 3 500,00 |

Местонахождение – г. Светлогорск, ул. Свердлова, 3, тел. для ознакомления и осмотра +37529 698 53 03, Игорь.

**Для участия в торгах необходимо в срок по 22.04.2019 г. 17.00:** 1) перечислить задаток по выбранному лоту на р/с BY06SOMA30120013860101000933 в ЗАО «Идея Банк», код SOMABY22, УНП 191113330, получатель – ЗАО «Белреализация»; 2) подать заявку по выбранному лоту на участие в торгах на сайте WWW.BELTORGI.BY; 3) направить в отсканированном виде все прилагаемые к заявке документы по адресу: marketing@zalog.by (подробнее – в информации лота на сайте WWW.BELTORGI.BY).

Шаг торгов – 5 %, задаток – 10 % от начальной цены предмета торгов.

Организатор торгов вправе отказаться от их проведения не позднее, чем за день до наступления даты проведения торгов. Торги проводятся при наличии не менее двух допущенных к участию в них участников. Победителем торгов признается лицо, предложившее наиболее высокую цену. Результаты торгов оформляются в виде протокола. Участнику, не выигравшему торги, задаток возвращается в течение 5 рабочих дней со дня проведения торгов. Победителю торгов задаток не возвращается и учитывается при окончательных расчетах по приобретению предмета торгов. Если заявка на участие в торгах подана только одним участником, торги признаются несостоявшимися. Предмет торгов продается претенденту на покупку при его согласии по начальной цене, увеличенной на пять процентов. Победитель торгов (претендент на покупку) обязан возместить сумму фактических затрат, связанных с организацией и проведением торгов, в течение 5 рабочих дней со дня их проведения, а также аукционный сбор. После этого между продавцом и победителем торгов в течение десяти рабочих дней со дня проведения торгов заключается договор купли-продажи

Перспектыва

# СТРАХАВАННЕ АД БАНКРУЦТВА...

## можа стаць абавязковым для ўсіх прадпрыемстваў

**Зараз усе зацікаўленыя бакі актыўна распрацоўваюць праект дакумента аб страхаванні рызыкі нявыплаты зарплаты пры банкруцтве арганізацыі. Аб гэтым паведаміла намеснік старшыні Федэрацыі прафсаюзаў Беларусі Алена МАНКЕВІЧ.**



Новая ініцыятыва абмяркоўваецца ў рамках генеральнага пагаднення паміж урадам, рэспубліканскімі аб'яднаннямі наймальнікаў і прафсаюзаў на 2019—2021 гады, якое ўступіла ў сілу 1 студзеня. Па словах намесніка старшыні, укараненне гэтага механізма абароны дазволіць работніку атрымаць гарантаваны даход за пэўны перыяд у выпадку банкруцтва даўжніка-наймальніка.

Адно з асноўных пытанняў, што можа паўстаць пры ўвядзенні такога страхавання: які павінен быць перыяд выплат? «Вопыт іншых краін паказвае, што патрэбны нейкія абмежавальныя бар'еры. Мы сышліся ў меркаванні, што правільна выбраць тры месяцы», — сказала Алена Манкевіч. Мяркуецца, што, калі прадпрыемства знаходзіцца ў стадыі банкруцтва і ў яго няма грошай на выплаты работнікам, з Фонду страхавання яно можа ўзяць сродкі на заработную плату, якую завінавацілася сваім работнікам за тры каляндарныя месяцы. У некаторых краінах такі перыяд складае пяць месяцаў, у некаторых — два. Пасля гэтага, калі прадпрыемства праходзіць санацыю і выходзіць на станоўчыя вынікі працы, яно вяртае суму ў фонд.

Разам з тым гэты механізм знаходзіцца ў прапрацоўцы. Федэрацыя лічыць, што станоўчы эфект ад увядзення прапанаванай сістэмы абавязковага страхавання значна перакрывае негатыў ад невялікага павелічэння нагрузкі на прадпрыемствы. Тым больш што ва ўмовах рынкавай эканомікі нават паспяховае прадпрыемства не застрахавана ад крызісных сітуацый. Такі від страхавання існуе досыць даўно і паспяхова ў прыбалтыйскіх краінах, а таксама ў Нарвегіі і Бельгіі.

Алена Манкевіч адзначыла, што практыка іншых краін паказвае страхаванне як від найбольш эфектыўнага механізма, які б дапамог людзям атрымаць заработную плату пры банкруцтве наймальніка. Намеснік старшыні Федэрацыі прафсаюзаў лічыць, што ён стаіць на абароне правоў работнікаў. Апынуўшыся ў такой сітуацыі, чалавек можа спакойна займацца пошукам іншай працы і не чакаць, калі яму выплацяць сумленна зароблены грошы.

**Сяргей КУРКАЧ.**

## Сталічны ЧАС

• На мінскія пляжы прывязуць 2,4 тысячы кубаметраў пяску найвышэйшага класа, паведамляе агенцтва «Мінск-Навіны». Перад новым купальным сезонам ім будуць падсыпаць усе пляжы Заслаўскага вадасховішча, пляжы № 5 вадасховішча Драздзы, №№ 2, 3, 4 Цнянскага вадасховішча. Пясок найвышэйшага класа самы высакаякасны сярод усяго пераліку кар'ернага пяску. Яго атрымліваюць шляхам фільтрацыі пяску ад розных прымесяў і часцінак з дапамогай шматразовага прамывання.

• Па даручэнні кіраўніка дзяржавы на працягу найбліжэйшых пяці гадоў у Фрунзенскім раёне сталіцы плануецца пабудаваць дадаткова тры ўстановы дашкольнай адукацыі ў Каменнай Горцы і дзве ўстановы агульнай сярэдняй і дашкольнай адукацыі. Пра гэта карэспандэнту агенцтва «Мінск-Навіны» паведамілі ў адміністрацыі Фрунзенскага раёна. У 2019 годзе плануецца ўвод у эксплуатацыю школы на 1020 месцаў з басейнам у межах вул. Шаранговіча — Гарэцкага — Рафіева. Таксама зараз вядуцца работы па ўзвядзенні сярэдняй школы ў мікраёне Каменная Горка 3, распрацавана праектна-каштарысная дакументацыя і атрымана станоўчае заключэнне экспертызы па будаўніцтве дашкольнай установы ў мікраёне Масюкоўшчына 5. Увод у эксплуатацыю гэтых устаноў плануецца ў 2020 годзе.

# ДА ГУЛЬНЯЎ ПРЫВЯДУЦЬ ЯКАСНЫЯ ДАРОГІ

## Адпаведныя службы гатовыя да мультыспартыўнай падзеі

**Работа па стварэнні якасных дарог у краіне напярэдадні II Еўрапейскіх гульняў вялася ўжо даўно, працягваецца яна і цяпер. Пытанне датычыцца не толькі дарожна-вулічнай сеткі Мінска, але і асноўных магістраляў, якія вядуць з Расіі і Еўрапейскага саюза. Рыхтуецца да Гульняў і транспартная інфраструктура горада, тут вядзецца падрыхтоўка пасажырскіх тэрміналаў аэравакзальнага комплексу і падрыхтоўка чыгуначнага вакзала, у тым ліку закупка адпаведнага абсталявання для набыцця электронных білетаў.**

Вялікую ўвагу гарадскія ўлады і дарожныя службы аддалі стану праезнага палатна і тратуараў. Спецыялісты «Гаррамаўтадара Мінгарвыканкама» летась правялі абследаванне вуліц, мастоў і пуцеправодаў горада, па выніках праверкі быў вызначаны і сфарміраваны пералік аб'ектаў, якія падлягаюць рамонту. Так, ужо ў 2018 годзе зроблены рамонт з поўнай заменай пакрыцця праезнай часткі транспартнага калідора агульнай плошчай 402 тысячы квадратных метраў. *«Гэта праспекты Незалежнасці, Пераможцаў, Жукава, вуліцы Арлоўская, Аранская, Прытыцкага,* — расказвае **галоўны інжынер «Гаррамаўтадара Мінгарвыканкама» Яраслаў ПАЎЛОЎСКІ.** — *На кальцавой дарозе заменена пакрыццё агульнай працягласцю чатыры кіламетры. Выкананы рамонт тратуараў на плошчы 18 тысяч квадратных метраў. Таксама былі адрамантаваны масты і пуцеправоды».*

Яраслаў Анатольевіч дадаў, што да 1 мая яшчэ запланавана выканаць рамонтныя работы на плошчы 209 тысяч квадратных метраў, гэта асноўныя вуліцы, якія фарміруюць транспартныя калідоры Еўрапейскіх гульняў (праспект Незалежнасці, МКАД, праспект Пераможцаў і інш.). Таксама будуць выконвацца работы на вуліцах, па якіх пройдуць велагонкі.

Спецыялісты галіны не абышлі ўвагай і трасы. Да 1 чэрвеня ў эксплуатацыю будзе ўведзена дарога М6 на ўсім працягу ўчастка 160 кіламетраў. *«Акрамя таго, мы скончылі рэканструкцыю дарогі Р80, якая з'яўляецца завяршэннем другой кальцавой дарогі,* — адзначае **начальнік галоўнага ўпраўлення аўтамабільных дарог Міністэрства транспарту і камунікацый Аляксандр ГАЛАЎНЁЎ.** — *Намі распрацаваны планы рамонту асноўных магістраляў, якія будуць прымаць гасцей. Цяпер прынята рашэнне і ўжо знаходзіцца ў завяршальнай стадыі разгляд аб выдзяленні 25 мільёнаў долараў на рамонт дарог, у першую чаргу магістральных. Сёлета траса М1 выйшла з зімы ў вельмі нездавальняючым стане, шмат нараканняў на ямачнасць. На гэтай дарозе будзе праведзена маштабная работа па замене пакрыцця. Думаю, да Гульняў яна ўжо будзе ў стане, за які не будзе сорамна. Гэта датычыцца і ўсіх дарог-выхадаў з Мінска (М4, М5, М6)».*

Таксама адзначым, што ў краіне ўрэгулявана сітуацыя з таксі, заключаны мемарандум, згодна з якім кампаніі ўзялі на сябе абавязацельствы не павышаць тарыфы на перавозку пасажыраў у час правядзення Еўрапейскіх гульняў. Гэтая тэма была сур'ёзна паднятая ў 2014 годзе падчас правядзення Мінскам чэмпіянату свету па хакеі. Тады нядобрасумленныя таксісты завышалі кошты ў дзесяць і больш разоў.

**Дар'я ЛАБАЖЭВІЧ.**

ФАКТЫ ПАДЗЕІ НАВІНЫ

### ЗАПРАШАЕ «ЧЫСТЫ ВАДАЁМ»

**Акцыя пад такой назвай пройдзе ў краіне з 11 да 19 красавіка. Яе з 2014 года традыцыйна праводзіць рэспубліканскае дзяржаўна-грамадскае аб'яднанне «Беларускае таварыства паляўнічых і рыбаловаў». Далучыцца да мерапрыемства могуць усе ахвотныя.**

За гэты час сіламі яго супрацоўнікаў разам з прадстаўнікамі іншых арганізацый, а таксама нераўнадушных грамадзян прыведзена ў парадак больш за чатыры тысячы кіламетраў берагавой лініі вадаёмаў і вадацёкаў краіны. У акцыі бралі ўдзел звыш 30 тысяч чалавек, было сабрана каля пяці тысяч кубаметраў смецця, якое вывезлі на палігоны цвёрдых бытавых адходаў.

### ЛІДЧАНІН ПРАКАЛОЎ 23 ШЫНЫ

**Так ён змагаўся з... выхлапнымі газамі.**

На вуліцах 1-я Хасанаўская і Урыцкага ў Лідзе ранкам аўтаўладальнікі 16 транспартных сродкаў выявілі, што нехта пракалоў 23 шыны. Варта заўважыць, што машыны былі прыпаркаваныя без парушэння ПДР, паведамляе УУС Гродзенскага аблвыканкама. Аператыўнік крымінальнага вышуку разам з участковымі інспектарамі міліцыі адпрацавалі раён. У поле іх зроку трапіў мясцовы жыхар 1965 года нараджэння. Пры размове з праваахоўнікамі мужчына прызнаўся ў здзяйсненні злачынства. Падазраваны растлумачыў, што пайшоў на такі ўчынак з-за выхлапных газаў ад транспартных сродкаў. Заведзена крымінальная справа.

### НА ДЗЯДУЛЮ ЗАГАРЭЛАСЯ КАШУЛЯ

**На наступны дзень яго ў бальніцу прывезла ўнучка.**

Удзень баранавіцкім ратавальнікам паступіла паведамленне з бальніцы пра тое, што з вялікімі апёкамі верхняй часткі тулава да іх прывезлі 86-гадовага мужчыну. Высветлілася, што напярэдадні дзядуля ставіў чайнік на газавую пліту і крысом сінтэтычнай кашулі зачапіў падпаленую канфорку. Адзенне імгненна ўспыхнула. Пенсіянер выбег на вуліцу, сарваў з сябе кашулю і вярнуўся ў кватэру. У той жа вечар вырашыў у бальніцу не звяртацца. Раніцай да старых прыехала ўнучка і, агледзеўшы дзядулю, забрала яго ў медустанову. Па інфармацыі МНС, мужчына трапіў у рэанімацыю. У кватэры агнём нічога не пашкоджана.

Ратавальнікі нагадваюць: будзьце асцярожныя пры абыходжанні з газавымі прыборамі і плітамі.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**


**ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА**
**РУП «БЕЛСПЕЦКОНТРАКТ» 16 мая 2019 года проводит 8-й открытый аукцион по продаже имущества республиканской собственности**

| Номер лота | Наименование техники | Местонахождение объекта | Начальная цена продажи (бел. руб.) | Сумма задатка (бел. руб.) |
|---|---|---|---|---|
| 91 | Грузовой бортовой Урал-4320 ш. 055111 дв. 899215 1986 г. *3 кат. 118 165 км* | г. Старые Дороги, в/ч 48668 | 8 600,00 | 1 720,00 |
| 92 | Грузовой бортовой Урал-43202 ш. 033841 дв. 711369 1985 г. *4 кат. 90 037 км* | г. Старые Дороги, в/ч 48668 | 8 500,00 | 1 700,00 |
| 93 | Грузовой бортовой Урал-432020-01 ш. КО132779 дв. 504468 1989 г. *4 кат. 17 267 км* | г. Старые Дороги, в/ч 48668 | 9 000,00 | 1 800,00 |
| 94 | Грузовой бортовой КамАЗ-43105 ш. 003845 дв. 765944 1985 г. *4 кат. 26 892 км* | г. Старые Дороги, в/ч 48668 | 9 000,00 | 1 800,00 |
| 95 | Грузовой бортовой КрАЗ-255Б1 ш. 599893 дв. 395495 1987 г. *4 кат. 10 897 км* | г. Старые Дороги, в/ч 48668 | 8 000,00 | 1 600,00 |
| 96 | Седельный тягач КрАЗ-255В ш. 218859 дв. 273647 1974 г. *4 кат. 29 493 км* | г. Старые Дороги, в/ч 48668 | 7 000,00 | 1 400,00 |
| 97 | Седельный тягач КрАЗ-260В ш. 558031 дв. 984144 1986 г. *4 кат. 8538 км* | г. Старые Дороги, в/ч 48668 | 9 000,00 | 1 800,00 |
| 98 | Седельный тягач МАЗ-537 ш. 84031726 дв. КТ4196 1984 г. *4 кат. 39 755 км* | г. Старые Дороги, в/ч 48668 | 9 000,00 | 1 800,00 |
| 99 | Тягач лесовозный МАЗ-509А ш. 29226 дв. 814809 1987 г. *4 кат. 480 км* | г. Старые Дороги, в/ч 48668 | 8 000,00 | 1 600,00 |
| 100 | Тягач лесовозный МАЗ-509А ш. 37720 дв. 9026245 1990г. *4 кат. 768 км* | г. Старые Дороги, в/ч 48668 | 8 000,00 | 1 600,00 |
| 101 | Автошасси Урал-4320-1012-01 ш. 112442 дв. 364924 1988 г. *4 кат. 111 820 км* | г. Береза, в/ч 23324 | 8 600,00 | 1 720,00 |
| 102 | Автошасси Урал-375 ш. 370189 дв. 585127 1982 г. *4 кат. 3056 км* | г. Береза, в/ч 23324 | 6 000, 00 | 1 200,00 |
| 103 | Грузовой бортовой Урал-432020-01 ш. 143337 дв. 577224 1990 г. *4 кат. 16 787 км* | г. Старые Дороги, в/ч 48668 | 9 000, 00 | 1 800,00 |

Аукцион состоится по адресу: г. Минск, ул. Казинца, д. 2, 6-й этаж **16 мая 2019 г. в 10.30.**

К участию в аукционе допускаются юридические лица, индивидуальные предприниматели и физические лица, оплатившие задаток, гарантийный депозит и подавшие заявление на участие в аукционе, соглашение, учредительные и другие необходимые документы до **15.00 13 мая 2019 года**.

Заключительная регистрация участников аукциона будет производиться **16 мая 2019 г. с 9.00 до 9.45.**

**Победитель аукциона обязан:**

1. Заключить договор купли-продажи не позднее 3 банковских дней с момента проведения аукциона.
2. Произвести оплату стоимости движимого имущества разовым платежом в течение **5** банковских дней для резидентов Республики Беларусь и **10** банковских дней для нерезидентов Республики Беларусь со дня подписания договора купли-продажи.

Задаток, указанный в таблице, а также гарантийный депозит в размере 300,00 белорусских рублей и денежные средства за выигранное имущество перечисляются на расчетный счет РУП «Белспецконтракт»: белорусские рубли – р/с BY51BPSB30121078830299330000, российские рубли – р/с BY05BPSB30121078830876430000 в ЦБУ № 701 ОАО «БПС-СберБанк», г. Минск, ул. Чкалова, 18, корп. 1, код BPSBBY2X, УНП 101099370, ОКПО 37401662 Корреспондент-Сбербанк России г. Москва № корсчета 30111810100000000090. Реквизиты банка: БИК 044525225, ИНН 7707083893 к/с в ОПЕРУ Московского ГТУ Банка России № 30101810400000000225, Без НДС. **Справки по тел./факсу (017) 398 05 41.**

# ПЕХАМ ПА ЎРАЖАННІ



## Для авантурыстаў

Віцебскія «Бермуды», беларуская тундра, лёгкія Еўропы — як толькі не называюць Ельню. Самае вялікае верхавое балота Беларусі раскінулася на поўначы краіны — у Мёрскім і Шаркаўшчынскім раёнах. Навукоўцы падлічылі, што гэтай дрыгве не менш за дзевяць тысяч гадоў. Мясціны сапраўды ўнікальныя: тут знаходзіцца больш за сотню азёр, а флора характэрная хутчэй для тундры, чым для Сінявокай. Штогод тутэйшыя жыхары выходзяць на «журавінавае паляванне», паколькі на балоце — самыя вялікія запасы гэтых ягад у краіне. Водары багульніку і верасу дурманяць галаву. А дзе-нідзе абавязкова чуецца покліч дзікай птушкі: тут жывуць каля 130 іх відаў, сярод якіх ёсць і «чырванакніжнікі» — чарнаваллёвая гагара і белая курапатка.

Дрыгва-ўзвышша — чулі пра такое? Асаблівасць Ельні яшчэ і ў тым, што цэнтральная частка балотнага масіву вышэй за краі на сем метраў. Во дзе сапраўднае дзіва!

Прыцягвае Ельня не толькі цікаўных турыстаў, але і тысячы жураўлёў падчас вясенніх і восеньскіх пералётаў. Ніхто не ведае дакладна, калі шызакрылыя птушкі аблюбавалі балота ў якасці перавалачнага пункта: можа, трыста гадоў таму, а можа, і тысячу.

І ўсё гэта можна ўбачыць, пачуць, пакаштаваць (я пра ягады, а не пра птушак!), трапіўшы на адмысловую экасцежку. Яна лічыцца самай працяглай і шырокай у Еўропе і ўяўляе сабой драўляны насціл праз самыя маляўнічыя месцы Ельні. Суправаджэнне не патрабуецца, пачатак — каля вёскі Канахі. Хаця можна заказаць экскурсію непасрэдна па багне. У гумавых ботах ці так званых балотаступах (маюцца і такія) пойдзеце, хлюпаючы па сфагнумавым моху. Тым, хто шукае новых адчуванняў, у Ельні прапаноўваюць маршруты на балотаходах (спецмашыны для паездак па багне).

## Для ўсёй сям'і

Першая і пакуль адзіная інклюзіўная экасцежка ў Беларусі знаходзіцца ў Валожынскім раёне на ўскрайку Налібоцкай пушчы. Ацаніць прыродныя багацці старажытнага лесу, зазірнуць у люстэрка хуткаплыннай Іслачы і пранікнуцца таямнічымі легендамі цяпер могуць і інваліды, і людзі сталага веку, і цяжарныя жанчыны на маршруце «Белакорац», не хвалюючыся за бяспеку. Уздоўж яго ёсць лаўкі, альтанкі і прыбіральні з безбар'ерным уваходам.

Адметнасць гэтай сцежкі ў стэндах, картах і макетах, якія яе суправаджаюць. Яны зробленыя такім чынам, што атрымаць поўнае ўяўленне аб унікальнасці хараства Налібоцкай пушчы можна і... далонямі. Інфармацыя падаецца яснай мовай і дублюецца шрыфтам Брайля. Па тактыльных картах невідушчыя могуць зразумець, куды ім рухацца, а макеты з дрэва дазваляюць навобмацак даведацца пра жывёл, птушак і раслінны свет гэтых мясцін. Летась непадалёк прайшоў першы «ІнФэст», пасля якога «Белакорац» папоўніўся новымі аб'ектамі — сэнсарнай сцежкай (па ёй трэба прайсціся басанож, каб «адчуць лес»), скульптурамі з лазы і хаткамі для дзікіх пчол і птушак.

Ноу-хау беларускай інклюзіўнай экасцежкі — пакрыццё з гранітнай крошкі (экалагічна чыстай, дарэчы), якое не дазваляе каляскам загрузнуць нават у непагоду. Таму і матулям з немаўляткамі ў гэтым лесе будуць радыя.

Майце на ўвазе, што побач з «Белакорцам» знаходзіцца некалькі аграсядзіб, якія таксама адносяцца да ліку безбар'ерных турыстычных аб'ектаў. Пракаціцца ў павозцы ці палюбавацца на маляўнічы бераг з сярэдзіны возера чалавеку, які даўно страціў магчымасць хадзіць? Калі ласка! Спякчы хлеб па старадаўніх рэцэптах і выведаць усе сакрэты пчаляроў, нават калі зроду не падыходзіў да пліты і ніколі не бываў на пчальніку? Можна!

## Для лянівых

Недарма Мінск называюць надзвычай зялёным мегаполісам. У сталіцы, акрамя шматлікіх паркаў і сквераў, ёсць дзесяць (!) экасцежак. У Ленінскім раёне — гэта «Сярэбраны Лог» і «Горад птушак». З першай аглядальнай пляцоўкі адкрываецца неблагі від на аднайменнае ўрочышча, а другая ідэальна падыходзіць для бёрдвотчынгу (*англ.* «назіранне за птушкамі»). Калі будзеце ў Чыжоўцы, то можна прайсціся па экасцежцы паміж вуліцай Убарэвіча і Свіслаччу. І абавязкова захапіце з сабой смартфон: тамтэйшыя стэнды з інфармацыяй маюць шматлікія QR-коды. Калі ў рэальнасці не пашанцуе ўбачыць зімародкаў, хоць на тэлефоне паглядзіце. Маршрут на Цнянскім вадасховішчы спадабаецца юным натуралістам і іх бабулям: тут і пра раслыннасць берагавой лініі, і пра лекавыя травы расказваюць. У парку «Курасоўшчына» растуць дубы-волаты — помнік прыроды, ад якога, кажуць, можна насыціцца энергіяй. Маецца экасцежка і ўздоўж вадасховішча «Лебядзіны», дзе з драўляных насцілаў назіраюць за воднымі беспазваночнымі. А вось у жыхароў Каменнай Горкі ёсць магчымасць пакарміць курапатак у халоднае надвор'е. Калі назіраць за Свіслачу на ўскраінах горада, то ёсць шанц пазнаёміцца з бабрамі, жукамі-плывунцамі і вадзянымі скарпіёнамі.

## Для рамантыкаў

Гатовыя адправіцца на край зямлі беларускай у пошуках папараць-кветкі? Бярыце білет да Брэста, а адтуль — да вёскі Ляплёўка. У самым паўднёва-заходнім куточку краіны знаходзіцца адзінае месца на тэрыторыі Усходняй Еўропы, дзе расце чыставуст каралеўскі, які і з'яўляецца правобразам таямнічай папараць-кветкі. Знайсці яе не так проста, але калі пойдзеце экасцежкай «Лясная рэчка», то абавязкова ўбачыце.

**Спытай любога беларуса, чым славіцца наша краіна, дык ён абавязкова адкажа: «Лясамі ды балотамі».**

Біясферны рэзерват «Прыбужскае Палессе» — месца цікавае і ў тым плане, што турысты не едуць сюды натоўпамі. Можна насамрэч дасягнуць «ляснога дзэну». Дарэчы, тутэйшая фаўна прызнаная самай багатай сярод усіх ахоўных тэрыторый Беларусі. На пясчаных дзюнах у глыбінях рэзервата адкладваюць яйкі чырванакніжныя балотныя чарапахі — равесніцы дыназаўраў.

Прыбужскае Палессе — гэта яшчэ і перакрыжаванне адразу трох культур, бо знаходзіцца каля самай мяжы. Да Украіны і Польшчы — літаральна крок ступіць. Падыходзіць для сустрэч з замежнымі сябрамі: візы непатрэбныя, бо гэта Брэсцкі раён.

**Ганна КУРАК.**
**Фота аўтара**
**і Анатоля КЛЕШЧУКА.**

### Даведка

**Экалагічны турызм — вандроўкі ў мясціны з адносна некранутай прыродай, падчас якіх адбываецца знаёмства з біялагічнай разнастайнасцю. Абавязковыя ўмовы для такіх падарожжаў — звядзенне да мінімуму адмоўных наступстваў наведвання запаведных мясцін.**

**Экасцежка — спецыяльна абсталяваны і асабліва ахоўны прагулачна-пазнавальны маршрут. Мэта — даць поўнае ўяўленне аб наваколлі, але зрабіць гэта на адносна невялікай па працягласці тэрыторыі. Таму экасцежкі досыць кароткія і пралягаюць праз самыя маляўнічыя і цікавыя мясціны заказніка ці парку.**

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*



**Лепшы час для наведвання Ельні – з мая па верасень.**

**Информационное сообщение о проведении аукциона по продаже гражданам Республики Беларусь в частную собственность земельных участков для строительства и обслуживания жилых домов в дер. Глинище, дер. Жажелка и дер. Приборье Жодинского сельсовета Смолевичского района Минской области**

| | | |
|---|---|---|
| 1 | Форма проведения аукциона | Открытый |
| 2 | Дата, время и место проведения аукциона | **14 мая 2019 года, в 10.00** г. Жодино, пер. Молодежный, 3 Жодинский сельисполком, кабинет № 1 |
| 3 | Продавец и его адрес | Жодинский сельский исполнительный комитет, г. Жодино, пер. Молодежный, 3 |
| 4 | Земельный участок, его кадастровый номер и адрес | **Лот № 1** – земельный участок площадью 0,1500 га с кадастровым номером 624881704101000059 в дер. Глинище<br>**Лот № 2** – земельный участок площадью 0,1500 га с кадастровым номером 624881705601000157 в дер. Жажелка<br>**Лот № 3** – земельный участок площадью 0,1115 га с кадастровым номером 624881712101000109 в дер. Приборье |
| 5 | Условия продажи | Без изменения целевого назначения |
| 6 | Целевое назначение земельного участка | Для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома |
| 7 | Начальная цена продажи | **Лот № 1** – 7 000.00 рублей<br>**Лот № 2** – 7 000.00 рублей<br>**Лот № 3** – 10 000.00 рублей |
| 8 | Условия проведения аукциона | А) продажа по цене не ниже начальной<br>Б) участниками аукциона могут быть граждане Республики Беларусь, постоянно проживающие на территории страны или приравненные к постоянно проживающим в соответствии с законодательными актами Республики Беларусь<br>В) наличие не менее двух участников<br>Г) без права предоставления рассрочки |
| 9 | Наличие инженерной инфраструктуры | **Лот № 1 (в населенном пункте имеется газоснабжение, водоснабжение)** |
| 10 | Сумма задатка и реквизиты продавца | 10 % от начальной цены земельного участка, р/с BY49AKBB36410616005746200000 в ЦБУ № 616 в филиале 612 ОАО АСБ «Беларусбанк», г. Жодино, ул. 50 лет Октября, 25А, БИК AKBBBY21612, УНП 600023532 (с пометкой «Задаток за земельный аукцион») |
| 11 | Порядок предварительного ознакомления в натуре с продаваемыми земельными участками | Каждую среду в 15.00 |
| 12 | Начало подачи заявлений | **11 апреля 2019** года с 8.00 до 17.00 каб. № 4 |
| 13 | Окончательный срок приема заявлений | 8 мая 2019 года до 17.00 |
| 14 | Условия, предусмотренные в решении об изъятии земельного участка для проведения аукциона и предоставлении победителю аукциона либо единственному участнику несостоявшегося аукциона | Внесение победителем аукциона либо единственным участником несостоявшегося аукциона в течение десяти рабочих дней после утверждения в установленном порядке протокола о результатах аукциона либо после признания аукциона несостоявшимся платы за земельный участок и возмещения затрат на организацию и проведение аукциона, в том числе расходов, связанных с изготовлением и предоставлением участникам аукциона документации, необходимой для его проведения и внесения платы за земельный участок;<br>осуществление победителем аукциона либо единственным участником несостоявшегося аукциона государственной регистрации создания земельного участка и прав на него в Смолевичском бюро Борисовского филиала РУП «Минское областное агентство по государственной регистрации и земельному кадастру» в течение двух месяцев со дня принятия решения о предоставлении земельного участка;<br>получение победителем аукциона либо единственным участником несостоявшегося аукциона, в установленном порядке, технической документации и разрешения на строительство жилого дома;<br>занятие (освоение) земельного участка не позднее одного года со дня получения свидетельства (удостоверения) о государственной регистрации создания земельного участка и права на него |
| 15 | Контактные телефоны | 8-01775 35-449, 8-01775 37-174, 8-01775 37-189 |

**Расходы по организации и проведению аукциона и затраты на публикацию информационного сообщения подлежат возмещению победителем аукциона и составляют: Лот № 1 – 1819,93 рубля; Лот № 2 – 1602,12 рубля и Лот № 3 – 1934,86 рубля (затраты без учета стоимости информационного сообщения).**

**Затраты на строительство, в том числе на проектирование объектов распределительной и транспортной инфраструктуры к земельным участкам, подлежат возмещению в порядке и случаях, предусмотренных в соответствии с Указом Президента Республики Беларусь от 7 февраля 2006 г. № 72 «О мерах по государственному регулированию отношений при размещении и организации строительства жилых домов, объектов инженерной, транспортной и социальной инфраструктуры».**

Примечания: для участия в аукционе на адрес продавца необходимо представить:

1. Заявление на участие в аукционе по установленной форме.
2. Копии платежных поручений, заверенные банком, подтверждающие внесение задатка на расчетный счет продавца.
3. Документ (копию), удостоверяющий личность (паспорт) покупателя или его доверенного лица.
4. Доверенность, заверенную нотариально (в случае если на аукционе интересы покупателя представляет это лицо)

**ЗАО «СМУ-77» извещает своих акционеров о том, что отдельными акционерами в период с 5 по 9 апреля 2019 года** поданы предложения о продаже принадлежащих им акций Общества в количестве до 1000 (одной тысячи) штук по цене 18 (восемнадцать) рублей за 1 (одну) акцию. Тел./факс 017-344-23-21

УНП 100064641

Утерянные ЗАО «СК «Белросстрах» бланк квитанции и бланки страховых полисов **считать недействительными**:

– квитанция о приеме наличных денежных средств (страховых взносов) формы 1-СУ серии СВ № 4458898;

– полисы «Добровольное страхование от несчастных случаев и болезней на время поездки за границу» формы 2РН, 2РП серии БИ №№ 1779418, 1774849, 1638928, 1732988, 1769317, 1766817;

– полисы «Добровольное страхование наземных транспортных средств (авто-каско)» формы 2РН, 2РП серии АК №№ 0146254, 0149222;

– полисы «Добровольное страхование от несчастных случаев» формы 2РН, 2РП серии НС №№ 0035455, 0035504, 0035505.

УНП 100782388

**ЗАСО «Промтрансинвест» предлагает принять участие в процедуре закупки № 2019-691949,** размещенной на сайте http://www.icetrade.by, по «Информационные технологии > Другое».

УНП 100357923

ЧЫРВОНКА
ЧЫРВОНАЯ ЗМЕНА
11 КРАСАВІКА 2019 г.
ЧАЦВЕР
№ 7 (15862)
Выдаецца з 21 красавіка 1921 года

Імёны

# NIZKIZ: «Мы ствараем беларускі рок»


Фота Рамана СТРЫГІ.

**Прадстаўляем чытачам «Чырвонкі. Чырвонай змены» сучасны беларускі рок-гурт Nizkiz, які апошнім часам стаў папулярны не толькі ў сябе на радзіме, але і ў замежжы. Хлопцы аднолькава цудоўна спяваюць на дзвюх мовах — беларускай і рускай, актыўна выступаюць на буйных фестывальных пляцоўках, кожны іх выхад на сцэну суправаджаецца аншлагам. Яны не перастаюць актыўна гастраляваць і выпускаць новыя сінглы, а білеты на іх раскупляюцца за месяц да канцэртаў. Такія песні, як «Guantanama», «Лірыка», «Люстэрка», «Небяспечна», «Сіноптык», «Інтраверт» ды іншыя для прыхільнікаў альтэрнатыўнага мэйнстрыму (а менавіта так часта любіць вызначаць жанр сваёй музыкі гурт) даўно вядомыя, і тых, у каго песнятворчасць маладых музыкантаў выклікае цікавасць, становіцца ўсё больш. Між іншым, у канцы 2018-га магілёўскі калектыў быў прызнаны найлепшым гуртом года ў штогадовай прэміі музычнага партала TuzinFM «Героі года», а выпушчаны не так даўно кліп на песню «Небяспечна» б'е ўсе рэкорды па праглядах на YouTube.**

**Аб сакрэтах поспеху калектыву мы спыталі ва ўдзельнікаў гурта, рокераў барабаншчыка Дзмітрыя ХАЛЯЎКІНА і гітарыста Леаніда НЕСЦЯРУКА.**

**А яшчэ даведаліся, чым яны займаюцца акрамя музыкі, пагаварылі пра тое, як летнік можа дапамагчы стаць артыстам і чаму ў Расіі разумеюць беларускую мову — пра ўсё гэта чытайце далей у нашым інтэрв'ю.**

**— Хлопцы, падзяліцеся, як вы прыйшлі да музыкі і з чаго ўсё пачалося?**

**Дзмітрый ХАЛЯЎКІН (Д. Х.):** — У нашым дзяцінстве інтэрнэту не было, адпаведна выбраць, якую музыку слухаць, можна было толькі з тых касет, якія ляжалі дома, ці з таго, што паказвалі па тэлевізары. У бацькі была, як я цяпер разумею, цудоўная падборка класічных рок-гуртоў накшталт Deep Purple, Queen, Pink Floyd, Scorpions і г. д. Іх я і слухаў. У 14 гадоў адпачываў у летніку, а там хлопец захапляўся гуртом Metallica. І я ўсю змену чуў яе фонам таксама. Моцна закранула. З таго моманту пачалося захапленне гэтым гуртом і пазней «цяжкай» музыкай у цэлым. Заслухваліся да «дзірак» усе альбомы, па тысячы разоў пераглядаліся відэа, якія ўдавалася знайсці. Прычым гледзячы відэа ці слухаючы іх музыку, я чамусьці заўсёды разумеў, як яна выконваецца на барабанах. Да таго ж аказалася, што я нарадзіўся ў адзін дзень з Ларсам Ульрыхам — барабаншчыкам Metallica. Гэта знак, падумаў тады я. У той жа час было вырашана, што неабходна стварыць свой гурт і станавіцца знакамітымі.

*(Заканчэнне на 8-й стар. «ЧЗ».)*

Пазнаёміцца з прафесіяй

# ПУЦЯВОДНЫ ГОЛАС ВАКЗАЛА

## Хто на ім працуе дыктарам

**Ці задумваліся вы, хто просіць Пецю падысці да мамы, якая чакае яго каля кас, і папярэджвае, што цягнік на Брэст затрымліваецца? Алена СТРЭЖ — адна з васьмі дыктараў станцыі Мінск-Пасажырскі. Мы распыталі яе, каго бяруць на такую работу, колькі аб'яў за дзень даводзіцца чытаць і ці можна рабіць у мікрафон заўвагі пасажырам.**


Фота Ганны ЗАНКАВІЧ.

Дыктарская — гэта невялікі кабінет на другім паверсе вакзала. Сцены абшыты гукаізаляцыйнымі панэлямі — каб не было рэха і не фаніла.

На стале перад Аленай — камп'ютар з раскладам цягнікоў, пульт з мікрафонам і чатыры тэлефоны. Адзін — унутрыстанцыйны, другі — гарадскі, па трэцім паведамляюць, на якія пуці прыедуць цягнікі.

— А гэты, — паказвае суразмоўніца на чацвёрты тэлефон — для сувязі са станцыяй Інстытут культуры. Бачыце ноўтбук? Мы ўключаем аб'явы і для іх.

Бацькі Алены таксама працавалі на чыгунцы. Мама — прыёмаздатчыкам, тата — спачатку начальнікам станцыі, потым дзяжурным па аддзяленні. Чаму дачка пайшла па іх слядах?

— Мне падабаецца працаваць у вялікай арганізацыі, тут стабільнасць, — тлумачыць яна.

Калі Алена паступала ў профільнае вучылішча (цяперашні Мінскі дзяржаўны прафесійна-тэхнічны каледж чыгуначнага транспарту імя Юшкевіча), думала падацца ў праваднікі. Але не прайшла камісію па зроку, таму абрала спецыяльнасць білетнага касіра. Пасля заканчэння вучобы працавала ў даведачным бюро, а гадоў сем таму стала дыктарам.

— Адмысловых курсаў у нас няма — усё асвойваем на месцы. Я пачынала падменнай — выходзіла на работу за тых, хто ў водпуску, хварэе. Добра памятаю сваю першую аб'яву. Я забылася, як правільна казаць, война і адключылася, — усміхаецца дыктар. — Самым складаным аказалася пераадолець сарамлівасць.

*(Заканчэнне на 4-й стар. «ЧЗ».)*

Інавацыі ў адукацыі

# НА «КАРОТКАЙ НАЗЕ» З АРХІМЕДАМ

## Ён бы вельмі пазайздросціў сучасным метадам выкладання фізікі

**Фізіка — традыцыйна самая складаная для абітурыентаў дысцыпліна на ЦТ з самымі нізкімі сярэднімі баламі. Электрастатыка, тэрмадынаміка, асновы МКТ, законы захавання, механічныя хістанні і хвалі, оптыка, кінематыка, квантавая механіка... Нават у чалавека, які даўно скончыў школу, успаміны пра гэты прадмет нярэдка выклікаюць думкі накшталт «дзякуй богу, што ўсё гэта ўжо ў мінулым»... Але настаўнікам аптымізму не займаць. «Проста не вучы фізіку ў школе і ўсё тваё жыццё будзе напоўнена цудамі і чараўніцтвам», — смяюцца яны. Чаму крынічная вада не замярзае зімой? Што агульнага мае космас з патэльняй? Ці можна зрабіць так, каб вада кіпела толькі ў палове пасудзіны? Чаму высока ў гарах вывіхі ў людзей адбываюцца часцей, чым унізе? Ці магчыма зрабіць, каб цела рухалася бясконца? Як працуюць нашы мабільныя тэлефоны? Здавалася б, элементарныя пытанні, але ці змаглі б вы даць на іх хуткі адказ?**

**«Фізікі баяцца бясконцасці, а матэматыкі яе абагаўляюць, пры кожным выпадку кажучы: «Давайце разгледзім бясконцае мноства...» Матэматыкі кажуць: «Давайце возьмем паралелаграм». Фізікі: «А дзе мы яго возьмем? Нам усё трэба памацаць рукамі», — жартуе загадчык кафедры фізікі Ліцэя БДУ Леанід МАРКОВІЧ. Трэба заўважыць, што тут з фізікай сябруюць усе — і прыхільнікі дакладных навук, і «лірыкі». І з заданнямі цэнтралізаванага тэсціравання ліцэісты нядрэнна спраўляюцца. Каб даведацца, як гэта ўдаецца педагогам ліцэя, мы накіраваліся ў навучальную ўстанову...**


Ігар Варакса і Леанід Марковіч: «Сучасныя інфармацыйныя рэсурсы пастаўлены на службу кафедры фізікі і ліцэістам».

*(Заканчэнне на 2-й стар. «ЧЗ».)*

ЧЫРВОНКА
Чырвоная змена
11 04 2019 г.

# НА «КАРОТКАЙ НАЗЕ» З АРХІМЕДАМ

## Зразумець і... палюбіць

— Паколькі мы ўдзельнічаем у эксперыменце па профільным навучанні, няпрофільныя прадметы (як, напрыклад, фізіка для гуманітарыяў), выкладаюцца ў нас не два гады, а толькі год. Гэта не значыць, што нейкія раздзелы школьнага курса для іх выпадаюць, проста ён сціскаецца, і дзеці не паспяваюць спужацца, — усміхаецца **намеснік дырэктара па вучэбнай рабоце Ліцэя БДУ, настаўнік фізікі Ігар ВАРАКСА.** — Яны маюць меншы набор прадметаў у адзін навучальны год, затое ў іх ёсць магчымасць больш часу прысвяціць любімай справе.

— Ліцэй калісьці распачынаўся менавіта з адкрыцця фізіка-матэматычнага профілю. Адметнасць нашай сённяшняй працы заключаецца ў тым, што нам даводзіцца рыхтаваць адначасова «спецназ» у фізіцы, а гэта дзеці, якім патрабуецца глыбіня, і «простых смертных», якім прадмет выкладаецца на зусім іншым узроўні. Канешне, прасцей працаваць з матываванымі дзецьмі, якія рыхтуюцца да алімпіяд, а вось выкладаць гуманітарыям — гэта ўжо алімпіядная задачка для педагога, якая патрабуе сапраўднага масцтва, — заўважае Леанід Марковіч. — Настаўнікі, якія займаюцца з ліцэістамі, што навучаюцца на гуманітарных профілях, валодаюць пэўнай харызмай. У іх ёсць свае сакрэты з акцэнтам на відовішчныя формы работы, дэманстрацыю вопытаў, і яны могуць паказаць, што **фізіка — гэта навука, без якой ты і кроку не зробіш у літаральным сэнсе, таму што крок — гэта таксама фізічны працэс.** Фізіка вывучае ўсё, што нас акружае, і што з намі адбываецца! І наша мэта — дапамагчы зразумець і палюбіць гэту цікавую, але далёка не лёгкую навуку.

У ліцэі заўсёды чытаўся факультатыўны курс для падрыхтоўкі да ЦТ па фізіцы, бо без гэтай дысцыпліны немагчыма ні паступіць на інжынерныя спецыяльнасці, ні трапіць у ІТ-галіну. Шэсць гадоў таму мы прапанавалі яго весці Ігару Мікалаевічу Вараксу, бо адчувалі: патрабуецца маладая і ўпэўненая рука, якая добра ведае, што трэба сучасным дзецям. Ён моцна яго мадэрнізаваў, пачаў прымяняць відэатэхналогіі, наладзіў сувязь з навучэнцамі праз электронны кабінет, перайшоў на мову, даступную для сучасных дзяцей, — мову смартфонаў. Шчыра кажучы, я і некаторыя іншыя старэйшыя педагогі спачатку скептычна паставіліся да яго ініцыятыў, казалі «дарма марнуеш час», але вопыт «баявой практыкі» паказаў, што ён меў рацыю, і мы рэзка прасунуліся наперад.

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «ЧЗ».)*



**Па меры запісу відэарашэнняў спасылкі, якія вядуць на анлайн-платформу, замяняюцца спасылкамі на відэафрагменты.**

## На мяжы сваіх магчымасцяў

— Да 2013 года сярэдні бал нашых выпускнікоў на цэнтралізаваным тэсціраванні быў 67, а цяпер мы маем 82—84 балы. Ліцэісты традыцыйна ўдзельнічаюць у міжнародных турнірах па фізіцы, фізічных баях, рэспубліканскіх і міжнародных алімпіядах. Але алімпіядная фізіка і фізіка на ЦТ — гэта ўсё ж розныя рэчы, — тлумачыць Ігар Варакса. — З пункту гледжання сярэднестатыстычнага абітурыента, заданні на ЦТ па фізіцы падаюцца непераадольнымі, але насамрэч нашы тэсты ў параўнанні з заданнямі расійскага Адзінага дзяржаўнага экзамену ці амерыканскімі сістэмамі кантролю ведаў не такія ўжо і складаныя. **Зусім не абавязкова ведаць падручнік ад першай да апошняй старонкі, але ЦТ патрабуе ад абітурыента сістэматызацыі ведаў.** Трэба быць знаёмым са спецыфікацыяй тэста, відамі заданняў, якія выкарыстоўваюцца на ЦТ, плюс валодаць навыкамі запаўнення бланка. Мы сабралі ўсе заданні па фізіцы на рэпетыцыйным і цэнтралізаваным тэсціраванні, якія публікаваў Рэспубліканскі інстытут кантролю ведаў з 2003 да 2018 года, разбілі іх па тэмах і ўзроўнях складанасці, адсартавалі такім чынам, каб у нашых навучэнцаў было дакладнае ўяўленне аб тым, што ад іх патрабуецца на экзамене.

Фізіку ў ліцэі здаюць прыкладна 100 выпускнікоў, з іх 60—70 чалавек наведваюць факультатыў па падрыхтоўцы да ЦТ. А калі ў аўдыторыі сядзіць такая колькасць будучых абітурыентаў, з імі складана працаваць звычайнымі метадамі. Таму я ўвёў некалькі электронных сэрвісаў. Дзеці рэгіструюцца ў асабістым кабінеце, атрымліваюць заданні, выконваюць іх, і я адразу бачу, калі масава пачынаюць няправільна рашаць тую ці іншую задачу. Значыць, трэба спыніцца і растлумачыць матэрыял! Ці, наадварот, большасць справілася, а ў двух—пяці чалавек узніклі нейкія праблемы. Можна, не адцягваючы ўвагу ўсёй аўдыторыі, проста падысці да іх, дапамагчы і накіраваць. На такіх занятках кожны працуе на мяжы сваіх, а не чужых магчымасцяў. Пры гэтым мы адпрацоўваем усе моманты, якія выклікаюць цяжкасці.

## Інтэрактыў для візуалаў

Кожны тыдзень нам трэба разгледзець 60—70 задач на пэўную тэму. Зразумела, што за дзве гадзіны на факультатыве мы праходзім недзе палову, а астатняе прыпадае на хатняе заданне. Але як можна ў гэтым выпадку ліцэістам дапамагчы? Так з'явілася ідэя запісу відэарашэнняў. Я пачаў убудоўваць іх у раздатачны матэрыял. З 1,5 тысячы задач, якія зараз ёсць у нашай базе, тысяча ўжо маюць відэарашэнні. І калі вучань дома не можа самастойна справіцца з тым ці іншым заданнем, ён з дапамогай мабільнага тэлефона «счытвае» QR-код і трапляе на сайт, дзе знаходзіцца відэатлумачэнне.

Кожны, хто займаецца падрыхтоўкай да ЦТ, раней ці пазней знаходзіць заканамернасці ў складанні тэстаў, прыдумвае розныя лайф-хакі, якія дапамагаюць сэканоміць час і дасягаць выніку з меншымі намаганнямі. Вось так і нарадзілася ідэя аб'яднаць усю гэтую карысную, але разрозненую інфармацыю пад адной вокладкай, **а прагрэс у тэхналогіях дазволіў перанесці разбор рашэнняў задач у віртуальную прастору.** Мне даўно хацелася зрабіць факультатыўны курс даступным для ўсіх старшакласнікаў, а не толькі для ліцэістаў. Вынікам стала серыя з 11 інтэрактыўных друкаваных дапаможнікаў. У новым выданні сабраная база заданняў за 15 гадоў з усімі зменнямі па раздзелах фізікі: «Законы захавання. Гідрастатыка», «Дынаміка», «Кінематыка», «Асновы МКТ», «Тэрмадынаміка», «Электрастатыка», «Пастаянны ток», «Магнітнае поле», «Ваганні і хвалі», «Оптыка» і «Квантавая механіка».

**Адметнасцю дапаможнікаў з'яўляецца выкарыстанне ў іх тэхналогіі дапоўненай рэальнасці.** Кожнай задачы ў падручніках прысвоены QR-код. Ён перанакіроўвае чытача да дадатковых матэрыялаў, відэарашэння або анлайн-формы з тлумачэннем алгарытму выканання. Я лічу гэтую працу плёнам сумеснай творчасці — педагогаў і ліцэістаў, якія на працягу многіх гадоў задавалі пытанні, дзяліліся цяжкасцямі, забяспечвалі вельмі каштоўную зваротную сувязь...

Нашы **дапаможнікі атрымаліся насамрэч інтэрактыўныя — кожны можа далучыцца да іх напаўнення.** Калі пры навядзенні камеры смартфона на QR-код відэарашэння па нейкай задачы не будзе, абітурыент перанакіроўваецца да анлайн-формы, у якой можна заказаць тлумачэнне ходу задачы. І па меры запісу відэарашэнняў спасылкі, якія вядуць на анлайн-платформу, замяняюцца спасылкамі на відэафрагменты. Такім чынам ты сам уплываеш на змест дапаможніка, а ўся астатняя супольнасць застаецца ў плюсе.

Калі мы выпусцілі ў лістападзе серыю SMART-дапаможнікаў, было запісана 65 гадзін відэа, але за два месяцы я запісаў яшчэ сем гадзін відэарашэнняў. За тыдзень набіраецца 420 гадзін праглядаў. Зразумела, што я ніколі б у жыцці не змог столькі часу запар тлумачыць дзецям, як рашыць тую ці іншую задачу — трэба было б не есці, не піць, а толькі займацца з абітурыентамі. Між іншым, у тыдні ўсяго 168 гадзін.

Якія яшчэ перавагі мае відэа? Калі табе незразумела, ты можаш запіс пераматаць. На сваім дзвайсе можна праглядаць тлумачэнне хоць дзесяць разоў, а вось калі ты перапытаеш у настаўніка тры-чатыры разы, то апошні, хутчэй за ўсё, пачне нервавацца. Да таго ж цяперашнія дзеці — гэта пакаленне візуалаў: яны не вельмі добра разумеюць прачытанае, а відэа ўспрымаюць значна лепш. Вось толькі відэаролікі не павінны перавышаць дзесяць хвілін, бо ніхто не стане глядзець на смартфоне твае паўтарагадзінныя лекцыі.



**QR-код перанакіроўвае навучэнцаў да дадатковых матэрыялаў, відэарашэння або анлайн-формы з тлумачэннем алгарытму выканання.**

## Гладыятары на тэстах

Цікавімся ў педагогаў, а якія ж з раздзелаў фізікі даюцца старшакласнікам цяжэй за ўсё?

— Найбольшая колькасць відэа (9 гадзін) утрымліваецца ў дапаможніку з заданнямі па электрастатыцы, таму што было вельмі шмат пытанняў ад ліцэістаў, — кажа Ігар Варакса. — Шэсць гадзін відэа запісана па тэме «Дынаміка», а вось, напрыклад, па квантавай фізіцы — усяго адна гадзіна відэарашэнняў, таму што ўсё, што вывучаецца ў 11 класе, — гэта, прабачце, дзіцячы сад. Самая складаная фізіка ў дзясятым класе: МКТ, тэрмастатыка, электрадынаміка... Патрэбны час, каб усё гэта асэнсаваць і засвоіць.

— Мы вельмі рады, што сучасныя інфармацыйныя рэсурсы з іх неабмежаванымі магчымасцямі пастаўлены на службу кафедры фізікі і ліцэістам, — канстатуе Леанід Марковіч. — Праблема скарачэння гадзін па прадмеце ў школьным курсе — праблема глабальная. І я, напрыклад, лічу, што квантавай фізіцы трэба аддаваць у 11 класе больш увагі, бо менавіта гэтыя веды спатрэбяцца затым у ВНУ.

**У Ліцэі БДУ плануюць падрыхтаваць падобныя інтэрактыўныя выданні таксама па біялогіі і матэматыцы.**

А што лічыцца сярод ліцэістаў найбольш прэстыжным: атрымаць 100 балаў на ЦТ або заваяваць узнагароду на міжнародных інтэлектуальных спаборніцтвах?

— Ліцэісты заўсёды на «баявым калі», і самая прэстыжная перамога ў нас — гэта перамога з «адкрытым забралам» на алімпіядзе. Калі ты гладыятар, то выйдзі на арэну і гэта дакажы, — канстатуе Леанід Марковіч. — Але ў нашых выпускнікоў ёсць і восем стабальных вынікаў. **Практычна кожны год хтосьці паказвае максімальны ці блізкі да яго бал, так бы мовіць, узорнае валоданне «зброяй» пры любым надвор'і.**

Летась адзін з нашых выпускнікоў, які перамог на міжнароднай алімпіядзе па фізіцы, вырашыў пайсці на факультэт прыкладной матэматыкі і інфарматыкі ў БДУ, але для яго стала нечаканасцю, што без здачы ЦТ туды прымаюцца толькі пераможцы алімпіяд па матэматыцы, інфарматыцы і астраноміі. Фізікі ў гэтым пераліку, на жаль, няма. Ён усміхнуўся і... пайшоў на цэнтралізаванае тэсціраванне. Як і належыць алімпіядніку, дапусціў памылку ў заданні з вобласці А (у адным з самых простых). Проста калі ты ляціш на звышгукавым самалёце, то забываеш, як карыстацца тумблерамі і выпускаць шасі на «кукурузніку». Мы жартавалі: «Лепш бы ты загінуў, як герой, у вобласці В». Але 98 балаў ён набраў і стаў студэнтам. Я проста хачу заўважыць, што падрыхтоўка да алімпіяды гарантуе вам паспяховую здачу ЦТ і высокія балы, а вось адваротнае — зусім не факт. Алімпіяднікі — людзі зусім іншай загартоўкі...

**Надзея НІКАЛАЕВА.**
**Фота аўтара.**

*Інтэлектуальны штурм*

# ЯК НАДРУКАВАЦЬ ТАБЛЕТКУ... НА 3D-ПРЫНТАРЫ

**Найлепшыя студэнты і магістранты краін Еўропы выступаюць у турніры навуковых перспектыў «Sciteen-2019», які праходзіць у Мінску з 8 да 12 красавіка.**

Арганізатары навуковага мерапрыемства — Нацыянальная акадэмія навук і Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт. Турнір накіраваны на развіццё даследчага патэнцыялу моладзі і рашэнне актуальных фундаментальных і прыкладных задач, якія знаходзяцца на стыку розных прадметных ведаў: фізікі, хіміі, біялогіі, медыцыны, экалогіі, ІТ-тэхналогій і іншых.

Свае навуковыя ідэі на турніры прадстаўляюць больш за 60 студэнтаў з вядучых універсітэтаў Беларусі, Расіі, Украіны, Германіі і Францыі. Сярод іх: БДУ, Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт інфарматыкі і радыёэлектронікі, Маскоўскі дзяржаўны ўніверсітэт імя М. В. Ламаносава, Санкт-Пецярбургскі дзяржаўны ўніверсітэт, Сколкаўскі інстытут навукі і тэхналогій, Кіеўскі нацыянальны ўніверсітэт імя Тараса Шаўчэнкі, Харкаўскі нацыянальны ўніверсітэт, Універсітэт Экс-Марсэль, Свабодны ўніверсітэт Берліна і іншыя.

Удзельнікам будуць прапанаваны задачы, звязаныя з 3D-друкам лекавых сродкаў, распрацоўкай платформы для пошуку зніклых людзей, стварэннем біянічнага вока, «Тэслы» для горназдабывальнай прамысловасці і іншыя. Свае навуковыя даследаванні канкурсанты прадставяць перад публікай, а таксама абмяркуюць іх у забаўляльнай палеміцы з сапернікамі.

**Надзея НІКАЛАЕВА.**

*Пары на парах*

# ШЧАСЛІВЫЯ РАЗАМ — НА ВУЧОБЕ І ДОМА

**Пяць маладых пар два дні змагаліся ў Магілёве за званне найлепшай у рэспубліканскім конкурсе студэнцкіх сем'яў «Шчаслівыя разам», арганізаваным Міністэрствам адукацыі, Беларускім прафсаюзам работнікаў адукацыі і навукі і Магілёўскім дзяржаўным універсітэтам харчавання. Палымяныя сэрцы аб'ядноўвае не толькі каханне, але і агульны побыт. А ён, як вядома, здольны разбурыць нават самыя моцныя пачуцці. І трэба прайсці добрую загартоўку, каб вытрымаць выпрабаванні і застацца разам. Конкурс стаў якраз тым месцам, дзе гэта пацвердзілася. Арганізатары паклапаціліся, каб у праграме было ўсё — ад вясёлых спартыўных спаборніцтваў і ўмення трымацца на публіцы да ведання асноў здаровага харчавання і размеркавання сямейнага бюджэту.**



Абсалютныя пераможцы першага конкурсу студэнцкіх сем'яў Кірыл і Дар'я Бутаравы.

— Мы доўга выношвалі ідэю правядзення такога конкурсу, — падзялілася **прарэктар Магілёўскага дзяржаўнага ўніверсітэта харчавання, старшыня аргкамітэта Вольга МАЦЫКАВА.** — Яна ўзнікла пасля вялікага педсавета ў Прэзідэнта, дзе было сказана, што мы павінны рыхтаваць не толькі добрага прафесіянала і грамадзяніна, але і сем'яніна. Міністэрства адукацыі нас у гэтым падтрымала.

Запрашэнне прыняць удзел у конкурсе атрымалі студэнты ўсіх ВНУ краіны. Трэба было ў вызначаны тэрмін падаць заяўку, зняць ролік пра сябе, а таксама прадэманстраваць праз фота гісторыю стварэння сям'і. Выпрабаванне прайшлі толькі пяць сем'яў. Чаму так мала? Запрашаліся выключна студэнцкія пары, а такіх аказалася няшмат. Часцей бывае, калі толькі адзін з сужэнцаў студэнт. Дарэчы, арганізатары ўжо падумваюць, каб у будучым пашырыць кола ўдзельнікаў. У тым, што конкурс будзе існаваць, сумненняў няма: рэзананс атрымаўся вялікі.

Тэме здаровага ладу жыцця і харчавання быў адведзены ўвесь першы дзень. Кулінарны іспыт пачаўся з майстар-класа ад Пятра Ануфрыенкі. Не так даўно «Чырвонка. Чырвоная змена» пісала пра гэтага таленавітага хлопца — пераможцу спаборніцтваў WorldSkills Belarus 2018 у кампетэнцыі «Кулінарнае мастацтва». Усе назіралі, як ён варожыць над рамантычнай вячэрай для дваіх. Пётр рабіў курынае філе са складаным гарнірам і паралельна інструктаваў канкурсантаў, як правільна харчавацца. Пасля дэгустацыі прыйшла чарга ім самім падзяліцца ведамі з гэтай сферы. Выкладчыкі ўніверсітэта падрыхтавалі шмат каварных пытанняў, якія толькі на першы погляд здаваліся простымі. Вось вы можаце, напрыклад, сказаць, што трэба зрабіць, каб амлет не быў «гумавы»? Не ведаеце? А Кірыл Бутараў з ходу агучыў правільны адказ: не трэба дадаваць муку. Гэтаму яго яшчэ маці навучыла. Наогул класічны амлет, сказаў ён, гэта яйкі (іх трэба ўзбіць), крыху солі і малака.

Як зрабіць, каб яйка пры варцы не лопнула? Што трэба дадаць, каб бурак не страціў колер? Калі саліць мясны булён? Пытанні сыпаліся адно за адным. Студэнты не здаваліся. Аляксандр Мярзлоў нават навукова абгрунтаваў, чаму варанае яйка, у адрозненне ад сырога, круціцца. Хоць чаго здзіўляцца, хлопец — студэнт Магілёўскага ўніверсітэта харчавання. А яго жонка Вераніка з лёгкасцю справілася з пытаннем, што рабіць, калі суп перасолены. «Проста апусціць у каструлю мяшочак з рысам», — сказала яна.

Пары, трэба адзначыць, аказаліся на рэдкасць дасведчанымі і прасунутымі. Прычым саліравалі мужчыны. Самай эрудзіраванай у пытаннях правільнага і здаровага харчавання сталі, ну хто б сумняваўся, Аляксандр і Вераніка Мярзловы, будучыя спецыялісты ў галіне харчовай прамысловасці.

А вось у наступным выпрабаванні «Капейка ў капейку», у які плаўна перайшла кулінарная эстафета, перамог Кірыл Бутараў. Мужчынскай палове прапаноўвалася набыць у краме прадукты для святочнага абеду. Для гэтага кожнаму выдалі па 30 рублёў і далі 30 хвілін на закупку. Кірыл справіўся лепш за астатніх. Зрабіць гэта, прызнаўся ён, было няцяжка, бо дома сам кухарыць і добра арыентуецца і ў прадуктах, і ў цэнах.

На сцэне Палаца культуры Магілёўскай вобласці адбылася самая адказная частка конкурсу. Канкурсанты спявалі, танцавалі, паказвалі тэатралізаваныя сцэнкі, па некалькі разоў змяняючы свой вобраз. Публіка была ў захапленні.

Першае месца ў выніку занялі Кірыл і Дар'я Бутаравы з Беларускага дзяржаўнага тэхналагічнага ўніверсітэта. Другое падзялілі Дзмітрый і Карына Меландэр з Гродзенскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя Янкі Купалы і Аляксандр і Вераніка Мярзловы з Магілёўскага дзяржаўнага ўніверсітэта харчавання. Трэцяе дасталося Андрэю і Вользе Астроўскім з Палескага дзяржаўнага ўніверсітэта і Аляксандру і Валерыі Максімовічам з Беларускай дзяржаўнай сельскагаспадарчай акадэміі.

— Паездка стала для нас цікавым сюрпрызам, — дзяліліся ўражаннямі Андрэй і Вольга Астроўскія. — Мы ніколі не былі ў Магілёве і з задавальненнем знаёміліся з горадам. Вельмі прыемна было стасавацца з іншымі парамі, разам нешта абмяркоўваць, хадзіць па крамах.

— Усё адбылося так хутка, што мы не паспелі азірнуцца, — дадаюць Аляксандр і Вераніка Мярзловы. — Мы шмат жартавалі, гутарылі, дзяліліся думкамі. Гэта вельмі карысны і патрэбны вопыт.

— Усё прайшло цікава, асабліва запомніўся фінал, — расказалі Валерыя і Аляксандр Максімовічы. — Народны танец станчылі на адным дыханні. Мы ж яго рэпеціравалі цэлы тыдзень. Спецыяльна хадзілі для гэтага ў наш гарадскі Дом культуры.

— А мы пра творчы нумар наогул даведаліся ў апошні момант, — прызналіся Дзмітрый і Карына Меландэр. — У выніку прыйшлося імправізаваць проста на сцэне.

Напэўна, гэтай непасрэднасцю сужэнцы Меландэр і скарылі аднаго са спонсараў конкурсу, які падарыў ім пазедку на Чорнае мора. Пераможцы атрымалі музычны цэнтр, усе астатнія — сталовыя і чайныя наборы посуду, абрусы. Партнёры мерапрыемства таксама адарылі ўдзельнікаў салодкімі прысмакамі. Яно і знамянальна: студэнцкі перыяд сямейнага жыцця — самы салодкі.

**Нэлі ЗІГУЛЯ.**
**Фота Рамана РУЦКАГА.**



Андрэй і Вольга Астроўскія: «Ну што, Вакула, здабудзеш мне царскія чаравічкі?»



Кацярына Бако, Ганна Снягір, Ганна Клімовіч *(злева направа)*.

*Абітурыент-2019*

# ЗАЗІРНУЦЬ НА «КУХНЮ» ВЕДАЎ

**ШОСТЫ раз праект «Студэнт на тыдзень» прыняў абітурыентаў на 16 факультэтах Белдзяржуніверсітэта: іх дзверы адчыніліся для 136 удзельнікаў. Старшакласнікі на працягу пяці дзён наведвалі розныя лекцыі і «прымяралі» на сябе такую жаданую ролю студэнта. Як прайшлі навучальныя будні «нававбранцаў»? Каб даведацца аб гэтым, мы зазірнулі на філалагічны факультэт БДУ.**

...У калідорах філфака шумна і шматлюдна. Сярод патоку студэнтаў складана вызначыць, хто з іх «пастаянны жыхар», а хто «часовы госць». Затое бачна, што ўсе любяць паесці — каля сталовай ажыятаж. Званок ад куратара групы Уладзіміра Рыдкіна — і праз некалькі хвілін перад намі 14 дзяўчынак, гатовых падзяліцца сваімі ўражаннямі.

Удзельніцы праекта прызналіся, што кожны дзень знаходжання на факультэце быў насычаны цікавымі парамі. Напрыклад, яны прысутнічалі на лекцыі па кітайскай мове, знаёміліся з лацінскай, успаміналі асновы сучаснай рускай мовы, даведаліся аб новых для сябе паняццях. Акрамя таго, хадзілі на сустрэчу з вядомай дзіцячай пісьменніцай, якая, як кажуць школьніцы, ніколі не паўтарае іх раўнадушнымі.

— Атмасфера на факультэце прыемная. Абстаноўка падобная на школу, толькі тут усё маштабнейшае. Сталовая добрая, з голаду дакладна не памром! А яшчэ крута, што наш куратар часта арганізоўвае для нас розныя актыўнасці. Напрыклад, мы хадзілі на экскурсію ў Нацыянальны мастацкі музей, — кажуць суразмоўніцы.

Акрамя наведвання лекцый абітурыенты пазнаёміліся з адміністрацыяй універсітэта, прыёмнай камісіяй і задалі ім пытанні аб паступленні. Аб праекце «Студэнт на тыдзень» удзельніцы даведаліся з розных крыніц. Напрыклад, **дзесяцікласніца Кацярына БАКО, навучэнка навагрудскай гімназіі № 1** і падумаць не магла, што раскажа ёй пра гэта... бабуля!

— Яна прачытала ў мясцовай газеце навіну аб наборы ў праект. Ідэя падалася цікавай. Доўга не думала — адразу напісала матывацыйны ліст і... забылася пра свой магчымы ўдзел! Але калі патэлефанавалі і сказалі, што я прайшла, вельмі ўзрадавалася. Знаходжанне тут дало разуменне: мне падабаецца англійская і ўсходняя філалогія. Думаю, у хуткім часе зраблю канчатковы выбар і буду спакойна чакаць паступлення ва ўніверсітэт.

**Ганна КЛІМОВІЧ, вучаніца 11 класа магілёўскай сярэдняй школы № 27** расказала, што даведалася аб праекце яшчэ два гады таму, але вырашыла прыняць удзел толькі сёлета:

— Я была няўпэўненая ў сваіх сілах, думала, што гэта не для мяне. Трэба пісаць матывацыйны ліст з выразна выкладзенымі думкамі, а ў мяне з гэтым праблемы. Але я перамагла сарамлівасць, бо вельмі хацела паступаць на філфак, і адправіла заяўку. Ні разу аб гэтым не пашкадавала. Гэта круты вопыт для ўсіх абітурыентаў. Спачатку наведванне лекцый здавалася складаным выпрабаваннем — усё ж такі гэта не 45 хвілін урока. Але пасля прызвычаілася і кожны новы дзень на факультэце чакала з нецярпеннем!

Не ўсе абітурыенты ўдзельнічалі ў праекце «Студэнт на тыдзень» упершыню. **Адзінаццацікласніца Ганна СНЯГІР, вучаніца сталічнай сярэдняй школы № 196**, аб праекце даведалася з сацсеткі Instagram тры гады таму. Летась дзяўчына была на гістарычным факультэце. Дзякуючы гэтаму вопыту яна зразумела, што ёй ён не па душы і трэба разглядзець іншыя варыянты для будучай прафесіі:

— На філалагічным факультэце мне вельмі спадабалася! На лекцыі па гісторыі рускай літаратуры мы праходзілі творчасць пісьменніка Аляксандра Радзішчава. Гэта крута, таму што ў школьнай праграме яго няма і многія падзеі з жыцця пісьменніка здзівілі і зацікавілі. На пары па сучаснай рускай мове выкладчык расказаў аб дзеясловах тое, што мы не ведалі дагэтуль. Для нас, абітурыентаў, была цікава, што інфармацыю падавалі не «з нуля», а на тым узроўні, на якім спыніліся студэнты. Прыходзілася хутка арыентавацца. А яшчэ цікава, калі выкладчык у канцы пары казаў: «Гэта мы разбяром на наступных занятках». Крыўдна, што мы ўжо туды не трапім. Хіба што як станем студэнтамі.

**Дар'я ШЛАПАКОВА,**
**студэнтка IV курса**
**факультэта журналістыкі БДУ.**
**Фота аўтара.**

ЧЫРВОНКА
Чырвоная змена
11 04 2019 г.

*Ідэі маладых*

# МАРЫ, ЗДОЛЬНЫЯ ЗМЯНІЦЬ СВЕТ




Фіналісты конкурсу, іх ментары і арганізатары на мерапрыемстве TEDxMinsk.

**Школьная лабараторыя, гульня ў шахматы для невідушчых, брэндзіраванне горада... Гэтыя ідэі з задавальненнем і непадробным энтузіязмам могуць увасобіць у жыццё падлеткі, якія жадаюць змяніць свет, — вучні 10—11 класаў, фіналісты сацыяльна-адукацыйнага праекта velcom YOUTH.**

Яшчэ нядаўна ў іх былі толькі задумкі, а ўжо сёння яны актыўна іх распрацоўваюць, сустракаюцца з ментарамі — прафесіяналамі ў сваіх сферах, і рыхтуюцца да галоўнага — выступлення перад вялікай аўдыторыяй на маштабнай канферэнцыі TEDxYouth@Minsk, якая адбудзецца 18 мая ў Мінску на пляцоўцы Prime Hall і збярэ сотні слухачоў і ўдзельнікаў з усіх куткоў Беларусі. Задача школьнікаў — цікава расказаць аб праекце ў звычайным для TED фармаце кароткіх паведамленняў, дзе галоўнае — данесці сваю ідэю да ўсяго свету і ўкласціся ў дзесяць хвілін. Абавязковая ўмова — выступленне на беларускай мове, якая з'яўляецца асаблівасцю праекта на працягу ўсяго часу.

Праекты дзесяці фіналістаў выбраны невыпадкова, яны сапраўды вартыя ўвагі. Слухаючы іх ідэі, бачыш натхненне і жаданне аўтараў працаваць, разумеючы магчымасці, якія раскрываюцца перад імі, не-не, ды і ловіш сябе на думцы: «Шкада, што раней такога не было». Колькі ж усяго можна было б зрабіць!

Так, цікавы сацыяльны праект прыдумаў і пачаў ажыццяўляць у сваім родным горадзе **адзінаццацікласнік Ілья БАРКОЎСКІ з гомельскай сярэдняй школы № 33.** Ён хоча распрацаваць мабільную праграму «Асабісты гід», якая б дапамагла жыхарам рэгіёна больш даведацца пра мясцовую гісторыю і архітэктуру. Пакуль што хлопец рэалізаваў адну частку задуманага: гід па горадзе вачыма Станіслава Шабунеўскага — беларускага архітэктара, які шмат зрабіў для Гомеля, але, на думку хлопца, пра яго забыліся. Ідэя прыйшла ў галаву летась, акурат, калі споўнілася 150 гадоў з дня нараджэння архітэктара. «Гэта было актуальна, — кажа хлопец, — таму мы разам з аднакласніцай і яе мамай-архітэктарам вырашылі прыдумаць штосьці годнае. Нам дапамог і настаўнік інфарматыкі. Усе разам зрабілі вэб-сайт пра Станіслава Шабунеўскага. Такім чынам, цяпер, дзякуючы мясцовым уладам, якія ўстанавілі на помніках архітэктуры QR-коды, ахвотныя з дапамогай смартфона могуць адсканіраваць іх і даведацца цікавыя звесткі пра горад на нашым сайце». Аднак вэб-сайт — толькі частка запланаванага Ільёй. Праект мусіць ахапіць увесь Гомель.

У **дзесяцікласніцы Паліны МУРАЕВАЙ са сталічнай сярэдняй школы № 10** — задумка з катэгорыі «Інклюзія». Дзяўчына ўжо даўно займаецца танцамі, і яе не можа не кранаць, што гэты від творчасці даступны не ўсім. «Мая ідэя — стварэнне шматфункцыянальнай інклюзіўнай арт-прасторы, якая павінна стаць месцам, дзе ў кожнага будзе шанц на творчае развіццё, не зважаючы на магчымасці і адрозненні, — адзначае Паліна. — Мэта праекта — аб'яднаць людзей. І не толькі ў рэальным жыцці. Калі гэта адбудзецца, мы разам можам зрабіць штосьці сапраўды крутое». Паліна ўжо стварыла старонку ў Інстаграме, дзе выкладвае серыю тэматычных фотасесій з людзьмі, якія не могуць паўнавартасна займацца творчасцю. Літаральна за некалькі дзён яе наведала каля шасці тысяч чалавек. Паліна атрымала дзясяткі водгукаў, а таксама пытанняў, як можна далучыцца да праекта.

А **дзесяцікласнік са слуцкай сярэдняй школы № 11 Артур ЦАРЫКОВІЧ** даўно захапляецца інфарматыкай. Ён самастойна распрацаваў мабільную праграму, якая дазваляе без дадатковых пазнак, напрыклад QR-кодаў, знайсці звесткі пра творчы аб'ект. «Напрыклад, я фатаграфую карціну і па здымку атрымліваю інфармацыю, якая мяне цікавіць, — расказвае хлопец. — Вы можаце сказаць, што Google робіць падобнае. Але раптам мастак не выклаў свой твор у інтэрнэт? А з дапамогай маёй праграмы ўсё робіцца працей: можна размясціць карціну адным клікам «Дадаць». Калі прапаную такую праграму музеям, там дакладна ўзрадуюцца. Па-першае, таму што аддам яе абсалютна бясплатна, а па-другое, ім не трэба будзе траціць час на расклейку QR-кодаў». Адметна, што праграма зможа знайсці інфармацыю нават па частцы карціны. Гэта зручна ў вялікіх музеях, дзе твор часта закрывае натоўп наведвальнікаў.

Пра школьнікаў-выдатнікаў дбае **адзінаццацікласнік са сталічнай гімназіі № 33 Максім ХАМЕТА.** Ён распрацоўвае заахвочвальную інтэрнэт-платформу для таленавітай моладзі, якая развівае ідэі, удзельнічае ў конкурсах, алімпіядах, канферэнцыях. На ёй змогуць рэгістравацца ўсе ахвотныя, будзе выстройвацца пэўны рэйтынг, а найлепшым — выдавацца невялікая плата. Яна будзе, магчыма, у асаблівай, унутранай крыптавалюце, якую можна будзе абмяняць на звычайныя грошы ці атрымаць школьныя прылады...

Нагадаем, што праект velcom YOUTH — сацыяльна-адукацыйны, які ладзіцца кампаніяй velcom пры падтрымцы Міністэрства адукацыі, а таксама арганізатараў канферэнцый TEDxMinsk. Усяго ў конкурсе зарэгістравалася больш за 800 самых актыўных школьнікаў, гімназістаў і ліцэістаў з 236 навучальных устаноў. Да фіналу дайшлі толькі дзесяць.

**Юлія АДАМОВІЧ, студэнтка IV курса факультэта журналістыкі БДУ.**

# ПУЦЯВОДНЫ ГОЛАС ВАКЗАЛА

***(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «ЧЗ».)***

Сёння большасць аб'яў чытае электронны голас (ён належыць Русі, салістцы гурта Shuma). А раней усё рабілася «ўручную». Колькі разоў за змену дыктар выходзіў у эфір, Алена ўжо і не памятае — вельмі шмат. Прыводзіць прыклад: кожны рэйс (за гадзіну іх можа быць дзесяць) патрабуе мінімум тры аб'явы.

**Цікава, што не ўсе знаёмыя Алены пазнаюць яе голас на вакзале — мікрафон скажае.**

— Тады і цягнікоў было больш, тых жа паўднёвых — у Феадосію, Еўпаторыю, Сімферопаль. Цяпер засталіся, лічы, толькі на Запарожжа і Мінеральныя Воды, — кажа суразмоўніца. — Аб'явы мы чыталі па-руску і па-беларуску, а калі рэйс міжнародны — яшчэ і па-англійску. У 2014-м, калі ў Мінску праходзіў чэмпіянат свету па хакеі, аб'яўлялі цягнікі на трох мовах. Не ўсе, вядома, — наўрад ці ў Асіповічы ездзіла шмат замежнікаў.

Алена прызнаецца: тады пасля змены дома зрэдку размаўляла. «Стамлялася горла, язык заплятаўся. Хоць я балбатушка па жыцці».



Фота Ганны ЗАНКАВІЧ.

Гадоў пяць таму працэс стаў больш аўтаматызаваны. На камп'ютары дыктара ўстаноўлена праграма, у якой ён закладвае расклад, прастаўляе пуці, куды будуць прыязджаць цягнікі. Праграма сама ўключае аб'явы. Але работніку трэба сачыць за часам, каб нічога не прапусціць, упэўніцца, што цягнік на месцы, перш чым запрасіць пасажыраў на пасадку.

Сваім голасам дыктары папярэджваюць, што хтосьці згубіўся, забыў дакументы ці білеты на касе, паведамляюць пра пазаштатныя сітуацыі.

— Патрэбна ўважлівасць, бо аднachасова даводзіцца апрацоўваць шмат інфармацыі. Змена доўжыцца 12 гадзін, і, каб не страціць канцэнтрацыю ў канцы рабочага дня, робіш гімнастыку. Стрэсавыя сітуацыі бываюць, вядома. Калі нешта спазняецца, ламаецца, ты павінен выбачыцца перад пасажырамі і спакойна ўсё растлумачыць.

...Алена націскае кнопку на пульце. «Тум-тум-тум», — гучыць знаёмая музыка. «Паважаныя пасажыры...», — зачытвае дыктар чарговае паведамленне.

— На старым пульце пасля аб'явы трэба было яшчэ раз націснуць на кнопку. І ведаю, што часам на гэта забываліся — рэцэпт піражкоў чулі ўсе, — жартуе жанчына.

Агаворкі? Бывалі, смяецца суразмоўніца: то «Вічэбск» скажаш, то «Магалёў».

— Я не пакутую ад праблем з горлам, у мяне рэдка знікае голас — можа, музычнае мінулае дае аб сабе знаць: у школе я спявала ў народным хоры. Калі нос закладзены, ты ахрып, пажадана ісці на бальнічны, бо аб'явы гугнявым голасам будуць гучаць незразумела і непрыемна. Але мы стараемся адразу лячыцца: падключаем чаі, пшыкалкі, ледзяныя.

Цікава, што не ўсе знаёмыя Алены пазнаюць яе голас на вакзале — мікрафон скажае.

Якія патрабаванні пры адборы дыктараў?

— Добрае вымаўленне, прыемны тэмбр: не надта высокі і не надта нізкі. Галасы з хрыпатой не падыходзяць, — перaлічвае жанчына. — З радыё і тэлебачання да нас не прыходзілі. Усе, каго памятаю, — з чыгункі.

З дыктарскай, дарэчы, з дапамогай джойсціка можна кіраваць відэакамерамі на некаторых платформах.

— Часам наводзім на пасажыраў, бачым, як тыя кураць у неналежным месцы.

— Заўвагу робіце?

— Калі заўважаю штосьці падазронае, паведамляю дзяжурнаму памочніку начальніка вакзала.

У вольны час Алена займаецца рукадзеллем, пяць гадоў таму захапілася вышыўкай. А нядаўна ёй падарылі ткацкі міні-станок, праўда, пакуль не было магчымасці яго апрабаваць. Кажа: «Я чалавек усядлівы, таму, напэўна, мне і працуецца тут добра».

Спяваць дыктар па-ранейшаму любіць. Прызнаецца: калі б запрасілі паўдзельнічаць у якім творчым конкурсе, з задавальненнем пагадзілася б.

**«Добра памятаю сваю першую аб'яву. Я забылася, як правільна казаць, войкнула і адключылася, — усміхаецца дыктар».**

Алене падабаецца падарожнічаць чыгункай. У дзяцінстве, напрыклад, кожнае лета выпраўлялася да бабулі ў Архангельскую вобласць. Ездзіла на цягніку таксама ў Львоў, Кіеў, Пецярбург — работнікам раз на год даюць бясплатныя білеты на міжнародны напрамак.

— Вядома, у іншых гарадах звяртаю ўвагу на работу дыктараў: як складаюць аб'явы, як часта іх даюць. Заўсёды думаю: вось бы схадзіць у госці, паглядзець, як у іх там.

**Наталля ЛУБНЕЎСКАЯ.**

*Пашыраючы прастору*

# «ЗБІРАННЕ І ЧЫТАННЕ КНІГ — НЕ САМЫЯ КЕПСКІЯ ЗВЫЧКІ»

**Арганізатар мінскага фестывалю «Горад і Кнігі» Вольга ВОЎК расказвае пра няпросты шлях ад ідэі да выканання, сваю каманду, талісманы і гісторыю мерапрыемства, а таксама — трохі пра новы літаратурны конкурс ды новыя пачынанні.**



Вольга Воўк.

* * *

Сітуацыя з выбарам працоўнага шляху ў мяне ў свой час склалася досыць стандартная: я не паступіла туды, куды хацела. Аддала дакументы на бібліятэчны, скончыла. І штораз, калі наважвалася сысці з прафесіі, падварочвалася нейкая цікавая справа, якую трэба было давесці да канца.

І вось так дасюль і ёсць. Зашмат цікавых спраў.

Любоў да чытання, думаю, на сёння рэч зусім не рэдкая. А тыя, хто робіць фестываль, звычайна пра сябе кажуць, што мы — закончаныя кніжнікі. Гэтым, напэўна, усё сказана.

У мяне дома вялікая бібліятэка. Я збіраю старыя савецкія выданні. Сучасныя — тут, на рабоце: у кватэры не змяшчаюцца. Увогуле, на мой густ, чытанне ды збіранне кніг — не самыя кепскія звычкі.

* * *

Адна з нашых даўніх ідэй — зладзіць хэнд-мэйд выстаўку з літаратурнымі персанажамі. Увогуле, нас ніколі не спыняе той факт, што, можа, і ўяўлення не маем, як рабіць


На фестывалі 2018 года.

нешта. Мы проста бяром і робім. І вось тады зусім не разумелі. Так што проста хадзілі па выстаўках лялек і казалі: «Слухайце, ёсць у нас такая ідэя... Можа, вы хочаце паўдзельнічаць?»

Была на першай выстаўцы работа, якая падняла хвалю абмеркаванняў — кібарг з «Касмаэпапеі» Вольгі Грамыкі. Па сюжэце нага ў яго адарваная, ну і сядзеў гэты кібарг-лялька на банцы згушчонкі, правады з яго вытыркалі. Я сама вельмі прыязна стаўлюся да Вольгі, асабліва люблю тую першую кнігу «Касмаэпапеі», і таму не дзіўна, што, калі работа засталася нам, мы яе сталі выстаўляць на кожным фестывалі. Яшчэ запомнілася авечка з кнігі Рыгора Барадуліна «Сябрына», яна ў мяне дасюль на застаўцы на ноўтбуку стаіць.

Адным словам, першая выстаўка «Усмешлівыя цуды» атрымалася, хай і далася складана: тэма ўсё ж такі была для нас новая. Ну і наконт назвы толькі лянівы не прайшоўся, маўляў, што ж вы робіце з вялікай ды магутнай, так жа не скланяецца! Але мы ўпартыя і зладзілі па-свойму.

* * *

Да той выстаўкі рабілі некалькі суправаджальных пляцовак з лекцыямі, майстар-класамі. Ажыятаж там быў такі, што мы зразумелі: усё, павінна быць праграма падобнага кшталту, і вялікая.

Таму на наступны год, у 2015-м, вырас вакол той выстаўкі сам фестываль.

Увогуле, яго з'яўленне наспявала даўно. Мы вось штогод наведваемся на кніжны кірмаш «Non/fiction» у Маскве. Мне сказалі нядаўна, што ўсе нармальныя людзі ездзяць на Міжнародную кніжную выстаўку ў першапрастольную, а ненармальныя — на «Non/fiction». Я пасмяялася і кажу: «Ну так, туды мы і ездзім».

Кожны раз, калі бывалі там, зайздрасць разбірала: чаму ў іх ёсць, а ў нас няма. Уваход на «Non/fiction», між іншым, платны, але кірмаш запатрабаваны: калі пад'язджаеш хвілін за дваццаць да пачатку — чарга стаіць аж да моста. І гэта зімою!

* * *

Цяжка, канешне. Асабліва з прафесіянальнай экспертнай пляцоўкай, якую мы ўпарта — упарта-упарта — працягваем трымаць. Спачатку яе размяшчалі на бібліятэкараў, пасля кінулі, сталі арыентаваць на ўсіх зацікаўленых. Народ туды не зганяюць, запрашэнні хіба што рассылаем — і ўсё. Пляцоўка тая, насамрэч, найменш папулярная на фестывалі, але з кожным годам усё болей людзей далучаецца. Мы яе з году ў год арыентуем на тое, пра што самі хацелі б даведацца.

Увогуле, мы разумелі, што будзе цяжка. Але не разумелі, наколькі. І ўсё роўна пачалі. Нам хацелася зрабіць нешта нефармальнае: маленькія выдавецтвы, маленькія ініцыятывы. Без пафасу, з вольным уваходам. І мы гэту сваю лінію вытрымліваем дасюль. То-бок, калі нам тэлефануюць класныя кіраўнікі і кажуць: «Дзяцей прывядзём, пакіньце месцы!» — заўжды адказваем: прыводзіць прыводзьце, але мы ім дазволім сысці, калі што. Адразу дзейнічаў прынцып добраахвотнасці: гэта мерапрыемства, на якое хочуць, а не павінны прыйсці.

Так і засталося.

* * *

Калі запускалі літаратурны конкурс «10+10», нічога не цямілі ў выдавецкай справе. Я, па шчырасці, апошнім часам веру ў непазбежнасць. У мяне і раней было падазрэнне, а цяпер гэта амаль упэўненасць, што фестываль існуе як ідэя і ён быццам бы сам прыцягвае да сябе патрэбных людзей. І мы не тое каб арганізатары, а такія ж складнікі той вялікай ідэі, якая нас да сябе прыцягнула.

І, скажам так, калі фестывалю захацелася мець свой зборнік прозы, знайшоўся і кіраўнік праекта, і выдавецтва, якое на тую авантуру пагадзілася, і фонд «Вяртанне» дапамог кнігам з'явіцца ў бібліятэках. Нешта такое ёсць карміччнае, адным словам.

Гэта быў першы раз — пасля «Усмешлівых цудаў», — калі ад фестывалю нешта рэчыўнае засталося. І проста гонар адчуваеш, калі дастаеш той зборнік і кажаш: а глядзіце! Для нас гэта — яшчэ адзін этап развіцця, сталення фестывалю.

* * *

Канцэпцыя «10+10» доўжыцца, адно гэтым разам маем не конкурс прозы, а вершаў і ілюстрацый да іх. Спачатку нас знайшла ідэя, досыць сырая, але пасля разам адпрацавалі механіку.

У выніку плануем зрабіць набор літаратурных картак з вершамі. То-бок, верш і ілюстрацыя да яго. У камплекце, атрымліваецца, 10 картак.

Сам конкурс будзе ў два этапы: спачатку вершаў, пасля — ілюстрацый да іх. Увогуле, адной з тэм сёлета будзе кніжная ілюстрацыя — нас вельмі ўразіла такая на кніжным фэсце ў Эдзінбургу. Таму хочам папрацаваць з беларускімі ілюстратарамі.

Увогуле, асабіста мне было б прыемна камусьці падарыць літаратурную картку. І я надта хачу, каб яны былі. Каб праект адбыўся.

* * *

Штогод фестываль змяняецца, факусуецца на розных тэмах. Гэта нармальна: немагчыма ахапіць усё і адразу.

Мерапрыемства будзе доўжыцца тры дні (замест звычайных двух) і пройдзе ў Навуковай бібліятэцы БНТУ — яна, калі задзейнічаць усе памяшканні, трошкі большая за Нацыянальную. Вопыт мінулага года з навальніцай і залевай нас напужаў і навучыў. Ну і раскідаем на тры дні мерапрыемствы — дзеля зручнасці.

Мы б хацелі задзейнічаць больш «чыстыя» фарматы, штосьці больш простае і літаратурнае. Сустрэчы з аўтарамі, напрыклад. Ад майстар-класаў і спектакляў, канешне, адмаўляцца не будзем.

Але фокус трохі зрушыцца на літаратуру як такую. Усё ж кніжны фестываль — гэта не толькі ўласна канцэнтрацыя кніг, але і кніжнікаў, аматараў чытання, літаратуры.

* * *

Традыцыя ў нашай фестывальнай камандзе, напэўна, адна. Чым больш неверагодная ідэя, тым з большым энтузіязмам усе кажуць: «Так-так, давайце, давайце зробім!»

Яшчэ, памятаю, як пасля першага фестывалю ў Нацыяналцы мы сабраліся ў кавярні абмеркаваць вынікі. Селі, пачалі казаць: вось тут было кепска, і тут, тут недапрацавалі, тут трэба інакш. І адна з нашых дзяўчат пытае:

— ...а што, хваліць мы сябе не будзем?..

Так што цяпер, збіраючыся, найперш кажам: «Усе малайцы, усе малайцы. А цяпер: вось тут было кепска, і тут, і больш так не робім!»

* * *

У камандзе, калі падлічыць, задзейнічана больш за 150 чалавек. Але гэта людзі на розных блоках, участках. Спачатку, калі фестываль толькі прыдумалі, нас было двое, а з іншымі мы дамаўляліся



Кібарг з «Касмаэпапеі» Вольгі Грамыкі.

па правядзенні асобных мерапрыемстваў. Але кожны год дадаюцца ў каманду новыя людзі, якія надалей працуюць нароўні з астатнімі. Звяртаешся да іх, яны дапамагаюць. Хтосьці штогод вяртаецца. Ёсць гарадскія мінскія тэатры, якія робяць прэм'еры, прымеркаваныя да «ГіК». Пытаюць, што за тэма, загадзя абдумваюць, рыхтуюцца.

Штогод дадаецца нейкі спецпраект. У такіх, натуральна, з'яўляецца кіраўнік, які працуе разам з іншымі арганізатарамі. Ну і праўда, што ж гэта мы самі па паўгода весялімся, рыхтуючыся, трэба ж дзяліцца той весялосцю. І дужа прыемна, калі чалавек, адпрацаваўшы з намі адзін раз, на наступны год адказвае: так, канешне, буду зноў!

* * *

Ну і важна сказаць, напэўна, што фестываль дабрачынны, безбюджэтны. Грошай у нас няма, працуюць з намі — за ідэю — валанцёры. Мы штогод аб'яўляем, у чым патрэбна дапамога — і людзі адгукаюцца.

Так што калі ёсць жаданне далучыцца да «ГіК», зрабіць уласны, вялікі ці маленькі ўнёсак — калі ласка.

Бо з кожным новым чалавекам фестываль робіцца лепшы.



Вокладка кніжкі праекта «10+10».

**Маргарыта ЛАТЫШКЕВІЧ.**

## Годовой отчет эмитента ОАО «АКТАМИР» за 2018 год

| **Информация об открытом акционерном обществе «Актамир» и его деятельности по состоянию на 01.01.2019 г.** | | |
|---|---|---|
| **4.** Доля государства в уставном фонде эмитента (всего в %) нет | | |
| **5–6.** Информация о дивидендах и акциях | | |
| Количество акционеров, всего | лиц | 3 051 |
| в том числе: юридических лиц | лиц | 1 |
| из них нерезидентов Республики Беларусь | лиц | 1 |
| в том числе: физических лиц | лиц | 3 050 |
| из них нерезидентов Республики Беларусь | лиц | 0 |

| | | |
|---|---|---|
| Начислено на выплату дивидендов в данном отчетном периоде | тыс. руб. | 64,4- |
| Фактически выплаченные дивиденды в данном отчетном периоде | тыс. руб. | 58,54 |
| Дивиденды, приходящиеся на одну простую (обыкновенную) акцию (включая налоги) | рублей | 0,23- |
| Дивиденды, фактически выплаченные на одну простую (обыкновенную) акцию (включая налоги) | рублей | 0,23- |
| Период, за который выплачивались дивиденды | месяц, квартал, год | за 2017 год |
| Дата (даты) принятия решений о выплате дивидендов | число, месяц, год | 28.02.2018 |
| Срок (сроки) выплаты дивидендов | число, месяц, год | по 31.12.2050 |
| Обеспеченность акции имуществом общества | рублей | 29,40 |
| Количество акций, находящихся на балансе общества, всего | штук | 0 |
| **7.** Отдельные финансовые результаты деятельности | | |
| Выручка от реализации продукции, товаров, работ, услуг | тыс. руб. | 1 251,0 |
| Себестоимость реализованной продукции, товаров, работ, услуг, управленческие расходы, расходы на реализацию | тыс. руб. | 1 008,0 |
| Прибыль (убыток) до налогообложения – всего (Прибыль (убыток) отчетного периода) | тыс. руб. | 186,0 |
| в том числе: прибыль (убыток) от реализации продукции, товаров, работ, услуг | тыс. руб. | 243,0 |
| прочие доходы и расходы по текущей деятельности | тыс. руб. | -84,0 |
| прибыль (убыток) от инвестиционной и финансовой деятельности | тыс. руб. | 27,0 |
| Налог на прибыль, изменение отложенных налоговых активов, изменение отложенных налоговых обязательств, прочие налоги и сборы, исчисляемые из прибыли (дохода), прочие платежи, исчисляемые из прибыли (дохода) | тыс. руб. | 52,0 |
| Чистая прибыль (убыток) | тыс. руб. | 134,0 |
| Нераспределенная прибыль (непокрытый убыток) | тыс. руб. | 1 730,0 |
| Долгосрочная дебиторская задолженность | тыс. руб. | 0,0 |
| Долгосрочные обязательства | тыс. руб. | 0,0 |
| **8.** Среднесписочная численность работающих | человек | 31 |

| | |
|---|---|
| **9.** Основные виды продукции или виды деятельности, по которым получено двадцать и более процентов выручки от реализации товаров, продукции, работ, услуг | Сдача в наем собственного недвижимого имущества (91,7 % к общему объему реализации) |
| 10. Дата проведения годового общего собрания акционеров, на котором утверждался годовой бухгалтерский баланс за отчетный год | 13.03.2019 года |
